506263

I 506.263

ДЗЯРГАЧ.

# ТЫПЫ ПАЛЕСЬСЯ

## АБРАЗКІ І ЛЕГЭНДЫ

Адбітка газэты „Грамадзкі Голас“

ВІЛЬНЯ 1924.

ДЗЯРГАЧ.

# ТЫПЫ ПАЛЕСЬСЯ

## АБРАЗКІ І ЛЕГЭНДЫ

Адбітка газэты „Грамадзкі Голас“

ВІЛЬНЯ 1924.

I. 506.263

BIBLIOTEKA NARODOWA *

Друкарня „Lux".

*Замест прадмовы.*

## МОЙ ЗАВЕТ СЯБРОМ.

Даю я вам, мае вы браточкі, завет апошні. Калі сьмерць мяне спаткае ў старонцы роднай, дык пахавайце мяне сярод лесу цёмнага, каб наўкола магутныя дубы і грабы маю магілу акружалі, каб белая бярозка лісьцейкам прыветна шапатала, каб краскі цьвілі ліловыя, каб хаўтурны звон, апошні звон, лес званіў. Хай птушкі песьняй вясёлай вечна лес напаўняюць. Каб лёгка было мне ляжаць пад лясной зямлёю. Каб чуў я, ак хмары зьбяруцца, пярун загрукоча... завее, забушуе бура над лесам... А ён, мой родны лес, лес Палескі, зашуміць! зашуміць на мне... Пад шум яго хаўтурны лёгка будзе мне сном вечным спачываць...

Дык памятайце, браточкі, мой завет апошні.

А калі злажу галаву сваю на чужыне, дык не забудзьце, хоць косьці мае калі кольвек, на маю старонку, ў мой родны лес, лес Палескі, перанясьці.

Аўтор.

I.

# Рубяжыцкая кантора.

— Што рабіць? што рабіць? — ламаў сабе галаву ўжо пасівеўшы спраўнік, седзячы ў сваім габінэце за пісьменным сталом, на якім перад ім ляжала вялікая купа папераў і добры куфаль піва.

— А каб вас паляруш пабраў! — лаяўся спраўнік б'ючы сабе па лысіне.

Відаць было, што перад ім стаяла заданьне нялёгкае, бо ўсю галаву і твар яго пакрыў пот і колькі ён ні думаў, а папера, якую ён чытаў ужо з дваццаць разоў, казала ясна, калі ён, спраўнік, N-скага павету, ня зьліквідуе Рубяжыцкае канторы, дык яму прыдзецца пададцца ў адстаўку, ды гэта што, а проста папера пагражае судом!

Вось на і выкусі!

Ужо дзесяты раз выходзіў дамавы стражнік, дзеля услуг, зваць яго высокаблагародзіе на абед, бо *барыня* кажа, што смажанае парасё астыне, спраўнік, хоць і глытаў сьліну,

але пасылаў яго, памінаючы ўсіх прабабак, к чортавай *мацеры*.

Дык і гэта яшчэ так як сяк, добра было-б, але горай за ўсё было тое, што нават патрэт цара Аляксандра Трэцяга, які вісеў на сьцяне паміж двух вокнаў над сталом, глядзеў на яго сурова і, здаецца, цар, усьміхаючыся сабе ў бараду, казаў:

— Ну-с, пане палкоўніку, пакажэце сваё стараньне і здольнасьць...

Дарэмна глядзеў спраўнік на патрэт, стараючыся знайсьці там выхад, але заўсёды спатыкаў суровы пагляд цара з усьмешкай.

Нарэшце, ня вытрымаў спраўнік і, моцна вылаяўшыся, падняўся з крэсла і рашыў такі пайсьці паабедаць.

— Ну, і нап'юся! — прабурчаў спраўнік, бяручыся за клямку дзьвераў. Але тутака як-бы хто яго піхнуў у бок і спраўнік адвярнуўся і зірнуў на патрэт цара. Што за праява?! Яму здалося, што цар кіўнуў яму галавой і сказаў: — Вось гэта правільна, раней выпіць, а пасьля дзела.

Але, апамятаўшыся, спраўнік плюнуў і вышаў з габінэту...

Абед падходзіў ужо да канца, калі спраўніку далажылі, што станавы прыстаў прыбыў, якраз з боку Рубяжыцкае канторы.

— Ага! — зароў спраўнік. — Пазваць! Згнаю! У Сыбір заганю! Разьнясу!

Праз момэнт перад ім стаяў, трасучыся як у ліхаманцы, зьбялеўшы станавы з пакетам у руцэ.

— Ну? — загрымеў на яго спраўнік.

— Так што, маю гонар дала...

— К чорту, к чорту! — загрымеў на яго спраўнік: — А кантора, кантора як?! — роў п'яны спраўнік. — Усё такі істнуе? А? істнуе?!

— Так што, пане палкоўніку, прыймаў меры, але ось мала што не 23 стражнікі і 3 вураднікі забіты... лапатаў станавы.

— Што, што? Забіты?—закрычаў спраўнік. — Гэтага яшчэ не хапала! У Сыбір! — грымнуў кулаком па стале спраўнік і ўскочыў на ногі.

— Зьлітуйцеся, вось рапарт, прачытайце! — залапатаў сьлязьліва станавы.

— *Ладно!* — гаркнуў спраўнік і, хістаючыся, скіраваўся ў габінэт. За ім на наскох папоўз, спусьціўшы галаву, станавы.

Доўга чула жонка спраўніка з габінэту грамавы бас мужа і сьлязлівы енк станавога. Часта туды насіў стражнік Аўдыцкі піва, а пасьля моцнай лаянкі і памінаньня усіх кузькіных матак, зьбялеўшы Аўдыцкі вынес адтуль таз з запэцканай крывёю вадой. Што

там было, ніхто ня ведаў, бо на пытаньне пані, Аўдыцкі паказаў пальцам угару, ды сказаў:

— Што там было — Богу ведама ды цару... толькі ось прыказана падаць гарэлкі ды добрай закускі.

Калі апошні прыказ быў споўнены, голас спраўніка сьціх і жонка нават чула, як быццам нехта ў габінэце з кімсь цалаваўся. Яе жаноцкае сэрца трохі закалацілася, ўчуўшы цмокі пацалункаў, але думка, што ў габінэце мужа, апроч станавога, нікога няма, яе супакоіла і яна пашла спаць.

— Мусіць прыйшлі да згоды, меркавала яна, і плян аб ліквідацыі Рубяжыцкае канторы знайшоўся!...

У той самы час, калі спраўнік з станавым прыдумоўвалі пляны на зьнішчэньне Рубяжыцкае канторы, ў гэтай самай канторы ў хаце, сярод глухога лесу, стаяў гоман, чуўся рогат і сьмех.

— Ну, і дзярбалызнулі мы яго з Гаўрылам па макаўцы, ў шартраз разьляцелася! га, га, га!

— Лоўка, шчыльна зрабілі! — рагатаў Дзядзёнак, праводзячы рукой па рыжай барадзе, а другою ляскаючы па плячы свайго спадручнага, Галабурду.

— А коні тутака? — пытаў ён.

— Тутака, — адазваліся галасы.

— Добра, добра, вып'ема за спакой душ!— зарагатаў Дзядзёнак і наліў у шклянкі гарэлкі.

Рубяжыцкая кантора гуляла...

Уся акруга траслася ад страху перад грабежнікамі. Ня было ніводнага двара, сяла і вёскі, каб не плаціла яна дані, калі хацелі гаспадары, каб коні іх былі цэлыя і хаты ня спалены.

Ня гледзячы ні на якія аблавы і засады на грабежнікаў, апошнія грабілі, забівалі людзей і ніякая паліцыя і войска не маглі даць ім рады.

Пра Рубяжыцкую кантору пісалі ўжо ўва ўсіх газэтах. Шмат прыставоў пайшло пад суд, шмат аддалі душу Богу, а мо' і чорту, гэтае пытаньне асталося адкрытым.

Нарэшце, Міністэрства Унутраных справаў зрабіла пастанову: „паслаць спраўніка Сыча ў той павет, у якім бupяніла кантора“. Яму далі срок, каб у тры тыдні зьліквідаваў ён кантору.

Ужо прайшло ня толькі тры, але цэлых дванаццаць, а спраўнік Сыч усё ніяк ня мог зваяваць Рубяжыцкае канторы.

Дык ня дзіва, што ён з станавым рашаў гэтае пытаньне на ўсялякі лад у сваім габінэце.

Гэтак было часта, гэтак было і ў гэты раз.

Калі жонка спраўніка соладка спала і сьніла пра перамогу свайго мужа над грабежніцкай канторай, Аўдыцкі вёу доўгую гутарку з вураднікам Мятлой, аб той самай канторы; і ня дзіва, што ўсе гаманілі аб канторы, калі нават міністры ў сталіцы і тыя гаманілі за кавай і ў салёнах аб гэтай самай канторы, а ўбраныя панічы пужалі паненак на вуліцах сталіцы зноў-жа гэтаю самаю кантораю.

— Далажы ці што, іх высокаблагародзію, а? — казаў вураднік Мятла Аўдыцкаму, даючы яму рубля, бо ведаў, што награда патрэбна сторажу спраўнікавай асобы, як рыбе вада...

— Папрабую, — рашыўся Аўдыцкі, хаваючы рубель у кішэнь, і на наскох ўвайшоў у пакой.

Падайшоўшы да дзьвярэй габінэту, ён пастукаў і праз мінюту выцягнуўся паваеннаму.

— Чаго? — падняў на яго галаву, зірнуўшы, спраунік.

— Так што вураднік Мятла, — ціха зашаптаў Аўдыцкі.

— Мятла! — гаркнуў на ўвесь звой грамавы бас спраўнік Сыч. — Пазваць Мятлу сюды! — зароў ён.

Са усіх ног кінуўся Аўдыцкі па вураднікa.

Але той, ужо ўчуўшы, сам бег, колькі

меў моцы, ў габінэт, не запомніўшы ўсадзіць у руку старанлівага Аўдыцкага другі рубель.

— Мятла! — спаткаў яго спраўнік і схапіў падняўшыся з канапы ў свае абняцьці атарапеўшага, нічога ня ведаўшага, вурадніка, які ніяк ня мог сьцяміць, што гэты сон знача, што яго так шчыра цалуе *сам* спраўнік.

— Мятла! Родны Мятла! Ты адзін! — басіў спраўнік, цалуючы нічога неразумеўшага вурадніка.

— Так точна, Мятла, адзін, — адказаваў ён нерашуча, цмокнуўшы спраўніка ў голены твар...

— Ну, сядай, сядай тутака, ось побач са мною! Прыстаў! Мятла, а? Мятла! Сам Бог паслаў! — басіў спраўнік і зноў цалаваў вурадніка, садзячы разам з сабою на канапу.

— Так, так сам Бог! — лапатаў ахмялеўшы станавы і таксама лез цалавацца з, нічога неразумеўшым, вураднікам.

— На, пі, друг! Збавіцель! — грымеў спраўнік і сунуў яму чарку з гарэлкаю.

— Што за праява! — думаў Мятла. — Ці ня сон гэта ўсё? — меркаваў ён і нават, каб ня убачылі, шчыпануў сябе за ляжку.

Але не! Дзе там сон? Ява! Самая праўдзівая ява! Ен, ён, просты вураднік Мятла, сядзіць на канапе з самым спраўнікам, а прыстаў рэжа яму кілбасу, налівае чаркі і нават

цара патрэт і той, як-бы, ківае яму галавой і кажа: — *Не робей*!

Мятла, глянуўшы на патрэт цара, гатоў ужо быў ускочыць і выцягнуцца ва фрунт, але апамятаваўшыся, што гэта толькі малюнак, трохі пасьмялеў і гаркнуў:

— Рад старацца, Вашскародзе!

— Ось, ось, пі! Я рад! Я... Сам Бог паслаў! — гаманіў спраўнік.

— Цяпер, канец для канторы! — крыкнуў прыстаў.

Ад гэтага ўспаміну аб канторы, Мятла чуць не падавіўся кавалкам кілбасы, але ўдар, у плечы кулаком спраўніка, памог кавалку шчасьліва папасьць у жывот.

— Так, брат Мятла, на цябе адна надзея! Зьніштож, браце, кантору! Азалачу! — зьвярнуўся да яго спраўнік.

— Вось яно што! — праняслося маланкай у галаве вураднікa, — мая мара збываецца...

— Зьніштож! — плачучы загаманіў прыстаў.

Выпітая гарэлка надала моцы і адвагі вураднікy і той устаў, выпрастаўся і загаманіў:

— Што-ж, я рад. Прыказ споўню! Я, вось, проект даўно нашу ў кішані, але ніяк ня мог, вось, дабрацца да вас, вашаскародзіе,

ня было сьмеласьці, — і, сказаўшы гэта, ен выцягнуў зложаную паперу і падаў спраўніку.

Той схапіў і, працягваючы да прыстава, прыказаў чытаць.

Плян зьніштажэньня канторы быу прасты: Узарваць у паветра ўсю хату з усімі зладзеямі, а зрабіць гэта бярэцца Мятла.

Пакуль чытаў прыстаў паперу, мары аб падвышэньні і наградах далёка занясьлі Мятлу.

— Дружа, зрабі! — кінуўся на шыю, спужаўшагася Мятлы, спраўнік.

Прышоўшы да прытомнасьці, Мятла ўскочыў і гаркнуў паваеннаму:

— Слухаю!

Да самай раніцы пілі гарэлку спраўнік, станавы і Мятла, цалаваліся, плакалі і на раніцы, саўсім ахмялеўшы, Мятла выпаўз з габінэту і ад'ехаў, пакінуўшы сьпячымі і п'янымі спраўніка на канапе, а прystава на падлозе.

Праз тыдзень усе газэты грымелі весткамі, што Рубяжыцкая кантора зьніштожана. Героямі гэтага, зьяўляюцца спраўнік Сыч і прыстаў Должыкаў, а аб зрабіўшым усё гэта вурадніку Мятле было сказана толькі тры словы: „Вураднік Мятла адтрымаў медаль *„За усердіе“*...

Ад кары ўцяклі толькі Дзядзёнак і ўнук яго Пётра...

[library stamp]

15.

II.

## Гандляры.

Гоніць вецер хмары па небе, сярдзіта грукаціць дождж па сьцёблах і лістох дубоў — плача непагода.

У хаце цёмна. Смалякі даўно ўжо пагарэлі, але класьці другіх ня хоча рыжы Дзядзёнак, а мо' забыўся, альбо мары занясьлі яго далёка. Ці яму цяперака да агню?

Чырвоны одбліск згасаўшых вуглёў ледзьве асьвятляў вялікую галаву, пакрытую рыжымі валасамі, атсьвечаваўся ў вострых вачох Дзядзёнка...

Прыемныя мары былі ў яго...

Вось ён малады, моцны, як дуб. З ім яго дзед Ярэм, сівы як голуб, але моцны дзед!

Пры ўспамінаньні аб ім уздыхае цяжка Дзядзёнак, пасьля, моцна сьціснуўшы кулакі, ён успамінае далей...

Вось, вось ночка... Прыемна сьвеціць з высокага неба месячык, сьнег хрумсьціць пад нагамі яго і дзеда Ярэма. Вось яны ля тыну

падлазяць да карчмы, ля якой стаіць тройка коняў і багатыя сані з мядзьведжай скурай. Смачна ядуць коні канюшыну, нясецца з карчмы песьня, плача гармонік. Моцна калоціцца сэрца ў яго. Вось яшчэ міг, яны з дзедам каля коняў, хвіля — дзед падбірае лейцы, а ён са стрэльбаю сядае ў сані і зорка глядзіць на дзьверы карчмы. Усё гатова. Коні крануліся і ў той міг раздаўся стрэл і моцны крык «стой!», як нажом, разрэзаў цямніну ночы. Але дзе там!

Дзед сьвіснуў і тройка панясласся...

Бах, бах, бах—грымяць ім усьлед стрэлы. Сьвішчуць кулі над галавой... Ці да стрэлаў, ці да куль, коні не бягуць, а ляцяць, здаецца, і толькі пыл ад сьнегу рэжа вочы...

Божа! што гэта? Што гэта? Цямнее ў вачох Дзядзёнка; чаму дзед схіліўся ў сані і нешта шапоча яму маладому...

Схіліўся да яго ён, крыкнуў: — «Дзедка, а дзедка, што табе»?

Яшчэ мацней рванулі коні, ад крыку яго яшчэ хутчэй пანясьліся...

— Дзедка родны, што табе?

— Памятай завет, ні ні... шапоча дзед і падае нялсывы.

— «Добра, дзедка, добра!»—шапоча Дзядзёнак пабялеўшымі губамі, — «памятаць буду, памятаць буду»...

Праходзяць гады. Шмат троек зьвёз Дзядзёнак, шмат душ ляжыць на яго сумленьні, але гэтага мала. Здаецца яму, што дзедава душа жадае ад яго большай помсты!..

— Добра, дзедка, добра! — гавора сам з сабой Дзядзёнак.

Плача за вакном непагода.

— Пара! — сказау ён глухім голасам і сам спужауся свайго голасу.

Заварушыўся Пётра на печы ад вокліку Дзядзёнка.

— Га, чаго?

— Пара — сказаў Дзядзёнак і палажыў смаляк на вугалькі. Загарэўся смаляк, асьвяціў хату.

Зьлез з печы Пётра.

Хутка апрануўся. — Ну? — пытаючы глянуў на Дзядзёнка. Той на яго.

— Едзем! — скамандаваў Дзядзёнак.

— Куды? — задаў пытаньне Пётра.

— Да станавога, па вараных, — адказаў Дзядзёнак.

— Гайда! — весела падмаргнуў Пётра.

Выйшлі з хаты. Сярдзіта сустрэла іх непагода. Сьцебануў дождж ім у вочы...

Праз хвілю два цёмныя коньнікі, як нейкія страшэнныя цені, нясьліся праз лес...

— Добра, дзедка, добра!—шапоча Дзядзёнак. — Споўню завет!

Нясуцца па небе цёмныя хмары. Сярдзіта дождж грухаціць па лістох і сьцёблах дубоў...

Плача непагода...

---

## III.

# Ганчар.

Доўга глядзеў Ганчар на каршуна, які ганяўся за нейкай птушкай, нарэшце, ня вытрымаў, прылажыўся і выстраліў са словамі:

— Вось табе, разбойнік!

Ад неспадзеўкі каршун узьвіўся раней уверх, але мусіць яго зачапіла добра шротам, бо ён, пачаўшы рабіць выкрутасы, ўпаў на зямлю. А, збаўленая ад сьмерці, птушка піснула і паляцела хутчэй да лесу.

— Ляці, — ласкава сказаў ёй усьлед Ганчар, закладаючы стрэльбу за плечы.

— Добры дзянёк будзе,—пачаў Ганчар.— Вось люблю гэтакія дні, калі на небе ніводнага воблачка ня ўгледзіш, а бачыш толькі адно неба, шырокае як мора...

Я паглядзеў на яго. Той зараз зірнуў на мяне і, ўсьмяхнуўшыся, сказаў:

— Я ведаю, чаго вы зірнулі на мяне, бо ў вас зьявілася пытаньне, ці бачыў я калі мора? Гэта праўду вы падумалі — я мора ня бачыў... казаў ён, цяжка уздыхнуўшы.

— Ну, але мары аб ім у мяне бываюць... Гэтак, вось, іншы раз, глядзіш на траву на нашым вялікім балоце альбо на сітняг, дык мяркуеш, ці ня так сама ходзяць па ім хвалі, толькі ведама вялікія... Па траве альбо сітнягу таксама ходзяць хвалі, калі вее ветрык. Ведаеце што, — казаў ён далей, — я нічога ў жыцьці не кахаю так моцна, шчыра, як кахаю лес... Гляньце на яго ўдзень, увечары, раніцай, уночы, ва ўсякі час ён мае сваё харство, будзь гэта ў добры дзень, ці ў буру. Заусёды лес цягне мяне да сябе. Здалёку, вось, чуеш як шуміць ён і, здаецца, шапоча, мане, заве... А як добра ў гарачы дзень разлегчыся дзе-кольвек на траўцы пад дубком; не агледзішся, як засьнеш пад ціхі гоман лісьцяў.

Прасьнешся, расплюшчыш вочы: наўкола стаяць сосны, елкі, дубы, бярозкі; з галін нясуцца птушак песьні і, здаецца, што ты папаў у рай, аб якім пішуць у сьвятых кніжках... А як прыемна ўчуць у лесе звон увечары! Гук плыве з званьніцы, ўваходзіць у душу, маніць да сябе, кліча зьвярнуцца да Бога. Увесь лес, здаецца, прыціхае, ні шуму лістоў, ні песьняў птушак, толькі ён, ён напаўняе лес, вячэрні гук звону...

Апошнія праменьні сонца іграюць яскрава н залатым, далёкім крыжы царквы ў сяле...

Хутка ночка настане, хутка зоркі замі-

гаюць на небе. Будзе спаць поле, будуць спаць людзі, будзе спаць і лес пад шэпт цудоўны ночы . . .

Не, ніколі я ня здраджу лесу, ніколі! — горача закончыў Ганчар і мы ўвайшлі ў лес.

— Вось ён! — зьняўшы шапку сказаў Ганчар. — Я ўваходжу ў яго як-бы ў сьвятыню Бога. Ці чуеце, як шапоча ён? Аб чым?

— Чую! — ціха адказаў я і таксама зьняў шапку.

Лес шумеў . . .

## IV.

# Белашапка.

У поўдзень я з Ганчаром зайшлі да нейкага хутара ў лесе. Уся хатка гаспадара была абсаджана яблынкамі, грушамі, вішнямі, сьлівамі і іншымі фруктовымі дрэвамі.

— Хто тутака жыве? — запытаў я.

— Хто жыве? — перапытаў мяне Ганчар, — а вось угледзіце самі...

Праўда, праз хвілю я ўгледзіў чалавечка маленькага росту, ў белых нагавіцах і сьвітцы. На галаве была саламяная шапка. Загарны твар, рэдкая бародка і вусы рабілі яго трохі сьмешным.

— А, Ганчар, здароў, здароў! — замахаў шапкай гаспадар хутара, угледзеўшы нас.

— Заходзьце, заходзьце! — крычаў ён, падбягаючы да нас.

Мы прывіталіся. Гэта быў той, усім вядомы, Белашапка, пра якога хадзілі пагаласкі ў вокрузе, як пра чалавека вучонага і добра знаючага гаспадарку, асабліва садаводзтва.

— Ось тутака, пад яблынкай добра будзе... Сядайце, калі ласка, — сказаў ён, паказаўшы на лаўкі і столік. — Сядайце, а я хутка прынясу мёду і малака... — крыкнуў ён і пабег у хату.

— Вось гэты чалавек, — казаў Ганчар, — хоча зрабіць на ўсёй зямлі фруктовы сад, — з усьмешкай закончыў ён.

— Як так? — зьдзівіўся я.

— Вось запытайце, вось ён сам, — сьціснуўшы плячыма сказаў Ганчар.

— Ну, вось мёд, малако, сыр, хлеб, лыжкі, шклянкі! — казаў Белашапка, напаўняючы стол частункамі.

— Дзякую, дзякую, — казаў я, — Добры ў вас садок, — пахваліў я, азіраючыся на сад.

— А добры, добры! — ажывіўся Белашапка на мае словы. — Гэта што! — пачаў ён размову, — вось каб мне ды балей зямліцы, гэтак з дзесяцін 30, дык вось паглядзелі-б, які сад я разьвёў-бы! Былі-б у мяне ўсялякіх гатункаў і яблынкі, і грушкі, сьліўкі, вішні, чарэшні, ўсяго-б насадзіў, завёў-бы пітомнік, школку. А там набраў-бы хлопцаў з вёскі, вучыў-бы іх садаводзтву, цый не павучонаму, а пасвойскаму...

Я паглядзеў на яго.

— Так, так, — загарачыўся ён і ўся яго

маленькая фігурка затраслася. Ён замахаў рукамі і чуць ня крычаў.

— Так, так, пасвойму, не павучонаму! Вучоныя аграномы вун што мне казалі. Вось, напрыклад, наконта гэтай яблынкі, — паказаў ён на яблынку, любоўна глянуўшы на яе, — вось казалі, што яна засохне, а тымчасам гляньце, ня толькі не засохла, а нават плады вось дае. А бачыце, што вучоныя, — вучоныя, толькі псуюць! — саўсім раскрычаўся Белашапка. — Вось вы гляньце навакола лес, дзіч — сосны, елкі, дубы, асіны, а што было-б, каб усё гэта былі яблынкі, ці грушкі? а? — пытліва глянуў ён на мяне. — Рай быў-бы, а? — пытаў ён далей.

— Ня рай, а нуда! — плюнуўшы сярдзіта, адказаў раптам Ганчар.

— Як нуда? Сад! Яблынкі, грушкі — нуда?! — наваліўся на яго Белашапка і між імі завязалася гарачая спрэчка.

— Эх ты, шэры! — лаяў яго Белашапка. — Нуда! Дык горшай няма нуды, як сядзець сярод дзікага лесу! Эх ты, культуры ня ведаеш! — закончыў ён.

— А ну цябе, з культурай! — агрызнуўся Ганчар. — Я толькі ведаю, што лес для мяне лепш за тваю культуру і сад.

— Дзікі лес лепш за сад? Не, не браток! — ледзьве ня з бойкай палез на яго Бе-

лашапка. — Ды ведаеш ты, што Гасподзь Бог і Той сад садзіў, а? ведаеш, ведаеш? — наступаў на яго ён.

— А ну цябе! — адкінуўся ад яго Ганчар, — патвойму сад — рай, а памойму — лес. Ну, дык і застанемся кожны пры сабе, — закончыў ён.

Але разыйшоўшыся Белашапка ўсё стараўся даказаць сваё і, каб мацней укалоць Ганчара, хрыпатым фальцэтам, глянуўшы на мяне, сказаў:

— Вось, далібог, заўтра, заўтра раніцай пачну лес секчы! вось пабачыш!

Пры гэтых словах Ганчар ускочыў, выпрастаўся і, б'ючы сябе кулаком у грудзі, грозна сказаў:

— Слухай, Белашапка! Калі ты хоць на хвілю зьявішся з сякерай у лесе, дык глядзі — наракай на сябе, я мазы не даю. Дый і саду твайму тады не здабраваць! — дадаў ён.

— Ага! — запішчаў Белашапка здаволены, што праняў такі Ганчара, і зарагатаў.

А Ганчар стаяў, насупіўшы вочы, і грозна паглядаў на рагатаўшага Белашапку.

— Ну, ну сядай, сябар, чаго там! — зьмяніўшымся голасам і ўжо ласкава загаманіў Белашапка, падходзячы да Ганчара.

— Сядай, сядай, я так браток пажарта-

waў... Не крану я лесу... Гэта ў нас заўсёды бывае, — зьвярнуўся ён да мяне.

— Вось як сойдземся, дык і пачнём — я пра сад, ён пра лес...

На хвілю замоўклі... Дзесь высока заліваўся яскронак на розныя лады. Сьверашчэлі малінаўкі і чыжыкі, ў галінах яблыняк зьвінелі пчолкі на красках, зьбіраючы мёд... Усё жыло! Усё хваліла Даўшага Жыцьцё... Ветрык ласкава калыхаў галіны дрэваў, быццам цалаваў кожную краску і далей ляцеў, прымусіўшы белую бярозку зашамацець усімі лісткамі, крануў высокую елку, якая пагардліва кіўнула яму на развітаньне вострай шапкай і зноў стала спакойна глядзець у высокае неба, з якога пасылала праменьні жыцьця далёкае сонца.

— Ну, пара! — перарваў цішыню Ганчар.

— Пайдзем, сябар! — зьвярнуўся ён да мяне. Я падняўся. Моцна сьціснулі на разьвітаньне далоні.

— Зямля — гэта Божы дом — замысьленна сказаў Белашапка.

— Праўда Ганчар? — зьвярнуўся ён да яго.

— Той глянуў на яго, на мяне і сказаў: Хадзем!..

— Мы пайшлі.

Белашапка доўга стаяў, гледзячы нам

усьлед і калі мы гатовы былі схавацца ў гушчары лесу, да нас даляцеў яго голас:

— Праўда Ганчар?

— Той адвярнуўся, зьняў шапку і крыкнуў:

— Лес — праўда-а-а!..

— Таксама і сад! — даляцеў да нас адказ Белашапкі, калі мы былі ўжо ў лесе.

— Хай і сад! — пракрычаў Ганчар.

Ня ведаю, ці чуў яго Белашапка.

Я ішоў і думаў: цікавыя яны людзі і колькі іх тутака захавана ў лесе?

Мы йшлі.

Лес шумеў, кланяўся нам сваімі зялёнымі шапкамі і, здаецца, чуць прыметна казаў:

«Сярод маіх грудзей знайдзеш ты, чалавеча, адпачынак і спакой. Болей нідзе»...

## V.

# Агнішча.

Ужо соншавы праменьні сьвяцілі чырвонай вячэрняй зарніцай, калі мы з Ганчаром селі адпачыць сярод трох вялікіх дубоў.

Ганчар любоўна паглядзеў на дубы, памацаў іх рукой і сказаў:

— Добрыя дубы. Мусіць разам расьлі, стаяць друг ля дружкі, як родныя браты!

І праўда, дубы расьлі адзін ля аднаго на роўным растанку, робячы пасярод сябе вельмі прыемны пакойчык у тры куты з розьніцай той, што ў гэтым пакойчыку замест столі была зялёная, густая страха з іхніх лісьцяў і галін, і замест лавак і стала былі тоўстыя карэньні, на якіх мы паважна расьселіся.

— Вось, бачыце, як добра! — задаволены загаманіў Ганчар, дастаючы з торбы сала, хлеб і бутэльку з самагонам... — У лесе ўсё магчыма знайсьці: і хату, і стол, і лаўкі і яду, — пачаў ён лічыць, — дый што там гаманіць — лес гэта ўсё, каб лесу ня было, дык вось, дальбо,

ня жыў-бы на сьвеце, а ніводнай хвілі, — закончыў ён, наліваючы гарэлку ў бяроставую прыгожую чарку.

— Вось маеце! — казаў ён — пеце да мяне.

Я выпіў. Самагон быў добры.

— Пасьля аднэй не закусваюць, — сказаў ён і наліў другую чарку, і гэта апынілася тамака, куды трапіла і першая.

— Вось гэта панашаму, ўсьмяхаючыся сказаў Ганчар, выпіваючы чарку за чаркай, кракнуў і пачаў есьці.

Ужо нашая вячэра падыходзіла да канца, калі Ганчар раптам з трывогай агляну́ўся і пацягнуў паветра носам.

— Гм, — прабурчэў ён. — Здаецца, нешта недзе гарыць, — сказаў ён, падняўшыся з месца.

— Так і ёсьць, недзе гарыць лес! — сказаў ён і пачаў хутка складаць у торбу харчы. Відаць было па ім, што ён быў моцна ўзбураны. Я ледзьве пасьпяваў за ім.

Сонца ўжо зайшло і цені станавіліся ўсё гусьцейшымі ды гусьцейшымі. Надыходзіла ночка. Але цемната ня шкодзіла Ганчару ісьці туды, адкуль ён учуў пах гарэлага лесу.

Ужо добра было чуць пах дыму і, нарэшце, мы апыніліся сярод палянкі, з якой валіў дым, а агню ня было відаць.

— Гэй, хто там? — крыкнуў Ганчар, здымаючы стрэльбу.

— Свае! — адызваўся спакойна голас з-за стаупоў дыму.

— Чаго-ж ты гэтакае агнішча разлажыў? — ідучы на голас, гаманіў Ганчар.

— Якое гэта агнішча — калі агню няма! — спакойна адказаў голас.

— Ты мусіць сырых галін нарубаў! — неспакойна забурчаў Ганчар.

— А мо цябе спужаўся, што? — адказаў голас.

Нарэшце, мы падыйшлі да кастра без агню.

— Ну, шчасьце тваё! — задаволенна сказаў Ганчар, вітаючыся з ім.

— Што шчасьце? — пытліва, зірнуўшы на яго, загаманіў чалавек.

— А тое, што не гальля, а моху наклаў, — адказаў Ганчар.

— Га, вось яно што! Гэта, браток, ад камароў, — адказаў чалавек.

— Гэта, сябар паляўнічы Караба, — сказаў мне Ганчар. — Пазнаёмцеся!

Мы паціснулі адзін аднаму моцна далоні.

## VI.

# Старая грэбля.

Сумна выглядае старая грэбля. Абрасла яна вялікай травой, між гнілога бярвеньня тырчыць сітняг, так і глядзі, каб дзе ня ўсунуць нагі ў чорнае гразкае балота.

Ціха, вечар надходзіў...

Гілякі ўсё часьцей і часьцей пралятали з сумным крыкам над намі... Цямнеў лес, змоўклі птушкі адна за аднэю. Хутка ночка прыйдзе на зямлю, будзе цёмна зусім у лесе.

Таёмныя казкі зашапочуць галіны, заплача дзесь сава, зашапаціць сітняг па краёх грэблі, а мы будзем ісьці ўсе далей, далей...

А калі ўзойдзе месяц на неба, асьвеце ціхім прыемным сьветам грэблю, цудоўна будзе выглядаць заснуўшы лес.

Будзе здавацца, што шмат страхаў хаваецца сярод яго. Будзе страшна ўваходзіць у яго гушчар...

Але дзе там! Ці страшна сярод яго, сярод таго, хто захаваў гэтулькі добрых успамінаў

аб роднай старонцы! Ці-ж страшна сярод цёмнай, няведамай, забытай грэблі, калі па ёй шмат гадоў назад мо' праходзілі байцы за долю лепшую, за родны край...

Гэй, птушкі вольныя, ня сумуйце, што будзе хутка ночка! Ня сумуй і стары лес! Сонца ўзойдзе! Узойдзе над лесам, над грэбляй! Асьвеце шлях наш далёкі...

Па ім мы пойдзем сьмела, горда! Гэй, ня сумуйце! Хоць ідзём старою грэбляй, але вядзе яна нас да згоды, да старых заветных магілаў!

Вядзе яна нас туды, дзе захаваны нашае волі штандар!

Мы йшлі далей...

---

## VII.

# Забытыя курганы.

Дык вось яны старыя курганы! Пад цяжарам зямлі сьпяць вечным сном нашыя прадзеды за лепшую долю Бацькаўшчыны мілай!

Ніхто ня прыйдзе прыбраць краскамі іх магілы, ніхто не паставіў ім сьвятога крыжа!

Толькі лес шуміць над іх курганамі, толькі птушкі пяюць над імі. Толькі ветрык плача часам сярод галін, і шапоча пра іх адвагу і сьмерць стары лес...

Дык адпачывайце сном вечнасьці слаўныя прадзеды! Адпачывайце спакойна, даражэнькія мае! Ужо скора завет ваш прыдуць спаўняць праўнукі вашыя... Ужо скора зварухнецца ад краю да краю наш брат-беларус!

Ужо скора зьбярэцца на сход вялікі, вось сюды на вашыя магілы!

Ці чуеце вы, як плачу я тутака над вамі, ці чуеце, як плача ўвесь народ?

Дык сьпеце-ж, прадзеды старых добрых дзён нашае старонкі! Сьпеце спакойна...

Сну вашага пільнуе цёмны лес! Пад шум яго галінаў, спакойна сьпеце, прадзеды! Вось чую ўжо, кліч ідзе... Гэта на сход кліча цёмны лес! Мы скора прыйдзем сюды грамадою і пойдзем даць прысягу адзін аднаму, што будзем бароцца да канца. . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Гэту прысягу дамо мы ўсей грамадою над магілай яго! Яго, старога байца за родны край — Касінскага Атамана!

## VIII.

# Магіла Касінскага.

Мы бадзяліся сярод курганоў. Але вось Караба застанавіўся ля аднаго кургана, на якім быў вялікі камень...

— Вось тутака, — сказаў ён — пахованы наш бацька, Касінскі...

Мы, ўсе трох, зьнялі шапкі.

Ціха было наўкола.

Лес шумеў, сьвяціў месяц, гарэлі зоркі на небе...

Сум нейкі апанаваў мяне і сьлёзы самі сабой каціліся з маіх вачэй.

Дык вось дзе ляжыш ты, бацька Касінскі, вось дзе косьці твае ляжаць!

Сьпі, баец наш родны!

Сьпі, хай душа твая ў раі разам з Богам глядзіць на нас цяпер, сіротаў, з высокага неба!

Хай няма цябе ўжо на сьвеце, але захаваўся сярод цёмных лясоў твой завет народу нашаму...

Сьпі, бацька Касінскі, пад ціхі гоман хваляў Случы!

Ад берагоў Лані да берагоў Случы і далей чуўся голас твой магутны...

Клікаў на барацьбу ты людзей за старонку родную, за родны край!

Сьпі спакойна, глядзяць зоркі з неба, сьвеце месяц. Шуміць ціха лес нам пра тое, што запаведаў ты нам... Завет твой памятаем!

Сьпі спакойна...

Ціха шапоча лес казкі пра адвагу і гонар байцоў, пра лепшую долю старонкі роднай, пра шчасьце былых дзён, пра нядолю і гора дзён горшых...

Шумі магутны лес!

Шумі так, каб шум твой пачулі ўсе!

Хай зьбяруцца на сход вялікі... Будзем спраўляць памінкі, будзем памінаць байцоў...

Іскрава сьвецяць зоркі, гамоняць хвалі рэчкі з сітнягом...

Ціха плача лес па байцох...

IX.

# Уночы на хутары.

Ось мінулі апошні курган. Ізноў пачалася грэбля, ізноў мы йшлі сярод лесу.

— Тутака недалёка, — загаманіў Караба, — ось толькі мінём гэты лясок — ізноў будзе бераг рэчкі Случ, ведаеце, робіць вельмі шмат выкрутасаў.

Здалёку пачуліся нейкія галасы і два стрэлы.

Мы застанавіліся і пачалі прыслухвацца да галасоў, якія далятали да нас аднекуль з правага боку.

— Га! Ось яно што! — раптам весела загаманіў Ганчар, — гэта мусіць наш стары Супрон альбо сына жэне, альбо хрэсьбіны спраўляе, — зарагатаў ён.

— Добрая фізыка! — памахаў галавою Караба, — альбо хрэсьбіны, альбо вясельле...

І мы ўсе разам зарагаталі.

Мусі сьмех наш пачулі, бо галасы змоўк-

лі і відаць было цяпер, што людзі, якіх мы ня бачылі, прыслухваюцца да нас.

— Пільнуй! — раптам пачуўся ў начным паветры нечы моўны воклік. Лес адказаў лёгкім рэхам.

— Ага! — зарагатаў Караба, — стары Супрон спужаўся дый крычыць, каб коняў пільнавалі... А ну, Ганчар, мы яго запытаем — „Каго“?

І яны разам у адзін голас закрычалі:

— Ці сына, ці дачку?

— У-у-у! — паплыло рэха па лесе.

Здаволеныя Ганчар з Карабой зарагаталі.

— Ага-га-га! — пачуўся нейкі крык.

— Хто там? — пытаў нечы голас з лесу.

— Тры дубы! — закрычаў Караба ў адказ, і не пасьпелі мы прайсьці і шагоў з дваццаць, як нас акружыла грамада людзей.

Гэта былі хлопцы, дзяўчаты і мусі сярод іх быў і сам гаспадар.

— Стой! што за людзі? — запытаў нас пярэдні.

Мы застанавіліся.

— Добра спатыкаеш сяброў, Супрон! — сказаў Караба.

— Караба! — вырваўся з гурбы людзей чалавек у белай сьвітцы і кінуўся абнімаць Карабу.

— Ось неспадзеўка, дык неспадзеўка!

Га, а гэта здаецца Ганчар і Дзяргач з вамі?— весела гаманіў ён, цалуючы нас. — Ось дык добра, дык добра!

Хутка мы прывіталіся з усей грамадой і пайшлі на хутар.

Праз мінют пяць уся грамада сядзела за сталамі ў садку пры сьвятле смалякоў, якія гарэлі на ўкопаных у зямлю калох. Ганчар не абмыліўся: стары Супрон жаніў сына Пётру, і мы трапілі якраз на вясельле, калі яно з хаты маладой пераехала да хаты маладога.

Гулянка йшла вялікая. Самагон ліўся ракой.

Але мы былі добра змучаныя паходам і я, глянуўшы на Ганчара, шапнуў яму, што добра было-б, каб дзе заснуць.

Той падняўся, прападаў недзе мінют з пяць, пасьля вярнуўся і, нахіліўшыся да мяне, шапнуў: — ёсь, хадзем!

Я ўстаў, да нас яшчэ прыстаў Караба і мы ўсе ўтрох няпрыкметна выбраліся з-за стала і пайшлі за Ганчаром.

Той завёў нас у гумно.

— Ось тутака ёсь драбіна, лезьце за мной! — парадзіў ён.

Хутка мы адзін за адным апыніліся сярод сена, дзе смачна заснулі.

Доўга я праз сон чуў сьмех і крыкі гу-

ляўшых сяброў, але пасьля так моцна заснуў, што нават ня чуў, як ужо раніцай Ганчар з Карабой будзілі мяне і ніяк не маглі дабудзіцца.

Так прайшла ночка на хутары.

— Ну, і сьпіцё вы моцна! — казаў Караба.

— Я ўжо меркаваў, ці не памёрлі вы ад учарашняга самагону?! Ну, хадзем, пойдзем у хату, паглядзім маладую, — весела гаманіў ён, падміргіваючы мне, — па дарозе ля студні памыемся, — скончыў ён і мы выйшлі з гумна.

Хутка памыліся і ўвайшлі ў хату. Нас сустрэў Супрон словамі:

— А вось яны дзе, ўцекачы! А я ўчора шукаў, шукаў, дзе яны падзеліся, але ось дзе... Ну, ну, сядайце, сядайце! — весела гаманіў ён...

## X.

# Зноў ў дарогу.

Добра пасьнедаўшы, я падзякаваў усім сябром за добрыя, прыхільныя адносіны і пачаў зьбірацца далей у дарогу.

— А то пабылі-б у нас які дзянёк! — запрашаў Супрон.

— Вельмі дзякую, сябру, але бачыце часу мала, а аб'ехаць шмат абшару трэба, — казаў я.

— Гэта праўда, — згадзіўся ён, — ну, дык як назад будзеце ехаць, калі ласка, прашу, не запамятавайце адведаць . . .

— Янка! — пазваў ён хлапца, — ось што, браток, адвязём ось сябру пад возера Князь да хутара Дзяніса . . . Ну, жыва, запрагай!

Праз мінют пяць, я сядзеў у возе. Цяжка было раставацца з сябрамі, а асабліва з Карабой і Ганчаром. Але што зробіш — доля наша такая!

— Но! — крыкнуў Янка на каня і мы крануліся.

— Шчасьліва! — казалі Супрон, Ганчар і Караба.

— Да пабачаньня! — грымела грамада, якая зноў пачала гуляць.

— Гэта вам ужо на дарожку! — сказала, падбегшы да воза, пачырванеўшая маладая і палажыла мне ў воз сыр, хлеб і кілбасу.

— А гэта, каб ехаць было добра! — сказаў Пётра, кладучы мне на калены бутэльку з самагонам.

Я падзякаваў. Воз крануўся.

— Бывайце здаровы! — крыкнуў я ўсім, зьняўшы шапку. — Не памінайце ліхам!

— Чакаем! чакаем! — грымела мне ў адказ.

Уехалі ў лес.

Усё жыло ў ім, цешылася з сонца, а мне было сумна на душы, цяжка на сэрцы . . .

— Хто п'е, таму налівайце! — данёсься да мяне нечы голас з гуляўшых хлопцаў на хутары . . .

Пеце хлопцы! Гуляйце пад шум лесу і гоман ціхі хваляў роднае рэчкі! Гуляйце!

Пакуль не пакліча вас доля старонкі роднай!

Цягнецца лес сьцяною, птушкі пяюць, весела сонца сьмяецца . . .

XI.

## У Дзяніса.

Ужо сонца садзілася. Ужо цені гусьцей зграмадзіліся і змоўклі птушак песьні, як мы з вялікай грэблі зыйшлі ў бок і кутка апыніліся ля тыну, якім была абгароджана ўся маемасьць Дзяніса. На падворку забрахаў сабака і праз мінюту сівы, як голуб, вышаў да брамы Дзяніс.

— Як маецеся, дзедка? — зьвярнуўся я да яго.

Той падазронна ўглядаўся на мяне, раптам у яго вырвалася:

— Ах Ты, Божачка, далібог, не пазнаў!.. І ён хутка пачаў адчыняць браму.

Мы заехалі на падворак.

— Ну, хутчэй, хутчэй, хадзем у хату, пягнуў ён мяне, — вось будзе Міхась рады...

— А Міхась у хаце?

— Есь, ёсь, толькі цяперака ён з стрэльбай троху выйшаў... — адказаў Дзяніс.

— А! — ківануў я галавой, — усё ходзіць...

— А як-жа... як устане, ось крыху паможа мне, дый шасьць у лес, толькі яго і бачылі, — сказаў дзед.

У хаце нас сустрэла прыгожая дзеўчына.

— Ну, пазнаеш, Ганка? — спытаўся Дзяніс у свае дачкі, якая прыглядалася да мяне.

— Пазнаю, — цьвёрда сказала яна.

— Як маецеся? — сказаў я, вітаючыся з ёю.

— Нічога, добра... Вось толькі маці памёрла... і дзеўчына спусьціла галоўку.

— Так Богу было трэба, — сказаў з цяжкім уздохам Дзяніс...

— Кніжак прывязьлі? — зьвярнулася яна да мяне.

— Вось, вось, — адказаў я і дастаў з кішаня цэлую пачку кніжак.

— Цікавыя?

— Усе кніжкі цікавыя, — перабіў яе Дзяніс.

— Ну, дзеўчына, давай нам чаю, есьці...

У гэты міг у хату ўвайшоў Янка з бутэлькай, кілбасай, хлебам і сырам у руках і ўсё гэта палажыў на стол.

— Ого! — падміргнуў Дзяніс, — з запасам!

— А, ось, Супрона сын даў гарэлкі, а яго жонка закуску, — адказаў я.

— Дык Пётра ажаніўся? — запытаў Дзяніс.

— Як бачыце, — адказаў я.

— Ну, давай Бог шчасьця! — сказаў ён.

Пакуль мы гутарылі з Дзянісом, Ганначка накрыла стол белым чыстым абрусом і прынясла кіпеўшы самавар.

— Гэта машынка — кіўнуў Дзяніс у бок самавара, — Міхасёва, ён прывез яе. Любіць піць гарбату ў гарачы дзень, кажа, што гэта ад жары першы ратунак, — засьмяяўся Дзяніс.

— Гэта праўда, памагае, але спачатку дык ня вельмі прыемна, але пасьля трэцяе шклянкі нават робіцца сьцюдзена, — адказаў я.

Калі мы пілі гарбату, прыйшоў Міхась.

Доўга мы гаманілі аба ўсіх справах і за гутаркай ня прымецілі, што на небе сьвяціў ужо месяц.

— Ну, пойдзем на сена, — сказаў Міхась.

Мы выйшлі з хаты. На падворку сядзела Ганначка.

— А вы што тутака робіце, а? — зьвярнуўся я да яе.

— Усё мары? а мары апанавалі відаць Вас, Ганначка? — запытаў я.

— Але! прыемна, бачыце, глядзець на далёкія зоркі, гэтак глядзіш на іх і колькі думак салодкіх, прыгожых пад ціхія чары іх надходзіць.

— Гэ, дык вы Ганначка, прыгожа гаворыце! — сказаў я, глянуўшы на яе.

— А што-ж, пасядзім на вольным паветры, — парадзіў Міхась.

— Ну, пасунься Ганначка, — сказаў ён і сеў побач з сястрою, абняўшы яе і прытуліўшы да сябе.

— Сядай, Дзяргач, — дый паможам Ганначцы шукаць адказу на ўсе пытаньні ў зорак, — казаў Міхась.

Я сеў. і мы пачалі гутарыць...

Ужо калі пачалі зоркі гаснуць на небе адна за аднэю, мы разыйшліся на адпачынак.

---

## XII.

# Возера Князь.

Ужо сонца стаяла высока, калі нас прыйшла будзіць Ганка.

— Уставай! — гаманіла яна, турзаючы Міхася, але ён мусіць знарок ня кратаўся, а наадварот пачаў храпсьці яшчэ мацней. Я расплюшчыў вочы.

— Ці ўстанеш ты, ці не? — турзала сястра брата.

— Хай сьпіць! — адказаў я.

— А вы ўжо ня сьпіцё, а толькі зьбіраліся і вас будзіць, ось як і брата, — казала яна.

Раптам Міхал падняўся і злавіў сястру за ногі.

— Ай! — крыкнула тая ад неспадзеўкі, і звалілася на брата.

— Ось я табе дам! Будзеш ведаць, як будзіць брата! — казаў Міхась і ўзяў яе казытаць.

Але Ганка хутка вырвалася з рук брата, і ўцякла.

— Прыходзьце піць гарбату! — крыкнула яна, выбягаючы з альтанкі.

Добра пад'еўшы, я з Міхасём пабралі стрэльбы і пайшлі на возера...

Ішлі мы гушчаром лесу па сьцежчы, якую добра ведаў Міхась.

— Гэтак, — казаў ён, — будзе бліжэй.

Па дарозе мы бачылі шмат цецярукоў, але не стралялі, бо меркавалі, што калі будзем вяртацца, дык спарней будзе прынясьці птушкі да хаты, чым цяпер цягацца з імі. Некалькі разоў сядалі мы адпачываць, але ня было яшчэ ніякай прыметы аб блізкасьці вады.

Але, ось, праз вярсты дзьве пацягнула з пераду халадком, і хутка мы апыніліся сярод густое травы, а праз шагоў 300 праз дрэвы заблішчэлі хвалі возера.

— Вось і возера!—сказаў Міхась, першы выходзячы з лесу...

Колькі хапала вока была вада, і другі бераг віднеўся, як-бы пакрыты туманам.

— Дых вось яно возера Князь, пра якое я чуў шмат легэндаў. Ось яно! Ува ўсім сваім харастве перада мнай!

Шмат корміць яно нашых братоў, шмат карысьці мае з яго селянін...

На берагох яго то там, то сям стаяць вёскі.

Бягуць хвалі адна за адною. Стройна стаіць сітняг, далёка займаючы ваду. Па ім

таксама ходзяць хвалі, але не жалезнага колеру, а зялёныя, да якіх цягне, і, здаецца, сярод іх знайшоў-бы адпачынак ад усіх трудоў чалавек...

Доўга глядзеў я на халодныя хвалі, і ня мог наглядзецца...

— А каб ты ведаў, якое хараство глядзець на яго, калі ў небе гараць зоркі, сьвеце месяц, якое тады хараство, — казаў Міхась. — Ось, пабачыш сам..

А, пакуль што, мары ў бок,—дадаў ён,— давай лавіць рыбу будзем, цяпер павінна добра брацца.

— Лавіць рыбу?— зьдзівўся я. — А чым?

— Чым?— перапытаў сьмяючыся Міхась.

— Вудою, браток, будзем лавіць...

І, не чакаючы мяне, ён схаваўся ў кустох і праз мінюту прынёс зьнекуль дзьве, добра наладжаныя, вуды.

— Ну, ось, маеш, — сказаў ён, даючы мне адну вуду. — Будзем лавіць на хлеб...

Я выбраў сабе добрае месца сярод кустоў, што расьлі над самай вадой, і пачаў прабаваць шчасьце. Але ці я ня ўмеў лавіць, ці проста глядзеў на плывук, ня думаючы аб рыбе, а толькі ўжо сонца зайшло, калі мяне паклікаў Міхась:

— Дзяргач, хадзі!

Я выйшаў з свайго куста і ўгледзеў Міхася з нейкаю дзяўчынаю.

Падайшоўшы бліжэй, я пазнаў ў дзеўчыне Ганку.

— Вы прыйшлі адны? — зьдзівіўся я, — і не баяліся?

Чаго-ж баяцца? — спакойна адказала яна.

— Я дарогу ведаю добра... Ну, дзе-ж ваша рыба? — запытала яна.

— Ось, усяго тры плоткі, — паказаў я тры рыбкі — па фунту вагай...

— Э, дрэнны з цябе лоўчы, — памахаў галавою Міхась, — ось, на, паглядзі, колькі іх нацягаў, — і ён паказаў цэлую нізаўку рыбы.

— Ну, добра, — сьмяючыся казаў ён далей, — калі шанцуе, дык і Халімон танцуе, а цяпер давайце іх чысьціць, дый зварым іх...

Мы ўсе дружна прыняліся за працу. Праз мінют 15 рыба была абчышчана і ляжала ў саганчыку, а пад ім весела гарэў агонь.

— Добрая будзе ночка, — казаў Міхась пазіраючы на неба...

— Ось маеце, рыба гатова, — сказала Ганка, здымаючы з кійка саганчык.

Усе дружна прыняліся за яду.

— Ну, ось і добра пад'елі, цяпер будзем пазіраць на дзела Божае, як кажа мой бацька.

Мы падайшлі бліжэй да вады і пачалі глядзець на возера.

Борзда цямнела неба. Ужо ня было відаць другога берагу. Адна за адною загараліся зоркі на небе, і з правага боку адсьвечваліся ў вадзе, то гінулі ад набягаўшай хвалі, то зноў зьяўляліся.

Усе ўтрох сядзелі моўчкі. Кожны меў свае мары, свае думкі...

Ось, ось, бачу я, як устаюць са дна возера сівыя дзяды з мечамі ў руках, выходзяць з хваляў адзін за адным на бераг... Зьяе штандар над імі, і голас я чую... «Сябры! Пэўна трэба нам зноў самым брацца за дзела, ня хочуць нашы праўнукі бараніць сваю волю, сваю старонку, пэўна трэба нам зноў сваею рукою падняць меч за волю старонкі роднай! Трэба нам пайсьці па вёсках, разбудзіць праўнукаў сваіх! Дакуль яны будуць жыць пад зьдзекам маскоўскім, пад чужацкай навалай!...

То ветрык шапаціць сітнягом, хвалі туману бягуць над вадой, то месячык прыгожы ўзыйшоў на неба пагуляць, а мне здаецца, што чую я голас загінуўшых дзядоў за нашу старонку, за волю і лепшую долю...

Пад хваляй халоднай ляжаць байцы, пад цяжарам курганоў, паўсюль на старонцы род-

най ёсьць сьлед змаганьня народу майго за долю і шчасьце Бацькаўшчыны мілай.

Дык гуляйце хвалі, гуляйце па абшары сваім, хай мацней сітняг шуміць, каб ніколі не забыўся брат мой бедны, што на гэтых берагох жыў, жыве і будзе жыць беларус...

Шапоча цёмны лес казку сваю. Таёмныя кажа легэнды лесу вада... Ночка пануе... Але хутка прайдзе яна, хутка згінуць зоркі адна за адною, і зноў сонца праменьні зайграюць па хвалях возера, па хвалях сітнягу...

---

XIII.

## Паляўнічы Караба.

Караба быў вельмі цікавы чалавек.

Адзеты ўвэ ўсё белае, маленькага росту, сьляпы на адно вока, з маленькай чорнай, ужо сівеўшай, бародкаю, ён сьмяючыся гаманіў:

— Я, ведаеце, сябе не памятаю другім чалавекам. Мне здаецца, што я радзіўся ўжо са стрэльбай і адразу пайшоў у лес і адсюль ужо болей нікуды ня выходзіў. Асьлеп я, ведаеце, ад таго, што заўсёды, як трэба страляць, дык левае вока заплюшчваю, каб зручней было. Ну, вось ад гэтага яно і ня бачыць болей нічога, — засьмяяўся ён.

— Ну, гэта не бяда! Затое ўжо мяне Бог абдарыў — страляю добра! — ўздыхнуўшы сказаў ён.

— Вось добра, што вы надайшлі, а то нудна было-б аднаму праводзіць ночку. Дый я, вось, гаманіць люблю і чуў, што вы запісаваеце ўсё, што належыць да нашага старога жыцьця. Ну, дык вось, я вам шмат-шмат чаго

цікавага раскажу аб нашым лесе, аб нашай старонцы. Вось, з чаго-б вам пачаць, — задумаўся ён.

Тымчасам Ганчар раздуў агонь, які заіграў весела, затрашчаў... іскаркі высока паляцелі ўгару, гаснучы дзесь у галінах дрэваў...

— Ну, вось добра, — пачаў Караба — сядайце, ды слухайце!

Мы прысунуліся да яго і ён пачаў:

## XIV.

# Стары Выжар.

— Месца, ў якім мы цяпер знаходзімся і, нарэшце, ўвесь гэты лес, у абшары ад рэчкі Лані да р. Случы і далей аж да возера «Князь», завецца Старым Выжарам.

Шмат гадоў таму назад гэта быў непраходны лес, ніводная чалавечая нага ня мела магчымасьці папасьці сюды. Толькі дзікі, медзьвядзі, дый ваўкі панавалі ў гэтым лесе. Людзі кажуць, што чалавек, які, адважыўшыся, пайшоў у гэты лес, як пайшоў дык і не вярнуўся болей у сваю вёску... Гэта быў такі гушчар, такі гушчар, што нават сонца ніколі туды ня мела магчымасьці паслаць сваіх праменьняў, а, часамі, калі разгуляецца непагода, заграхоча пярун, дык людзі ў вёсках, якія былі блізка ад гэтага лесу, палілі грамніцы і чакалі сьмерці, бо страшэнны грук, трэск у лесе пужаў іх. Але, вось, ішлі гады, людзі рабіліся сьмялейшымі і ўжо некалькі адважных пабывалі, ідучы праз лес, і на беразе Случы,

заходзілі й далей, аж да возера Князь. Гэтымі сьмелымі людзьмі, як казалі нашыя дзяды, быў з сваймі сябрамі Юрка Касы, якога нядоля загнала шукаць прытулку ў лесе, — ўздыхнуў Караба.

— Ну, але аб гэтым пасьля раскажу, а цяпер, ось, слухайце далей.

XV.

## Сьвет.

— Жыў сярод гушчару Выжару нейкі, кажуць людзі, Сьвет. Добра было яму сярод дрэваў, сярод галін. Весяліўся ён, бегаў, гуляў, ганяўся за зайцамі, ваўкамі, дужаўся з медзьвядзямі. Усе любілі Сьвета. Ніхто ня крыўдзіў яго. Зьвяры зрабілі яму добрае, мяккае ложка з сухіх лісьцяў і моху, пільнавалі яго сну. Птушкі пеялі яму песьні, казкі казалі, галіны бярозы пільнавалі яго ад камароў. Добра жылося Сьвету! Усяго яму было даволі. Пчолкі мёдам кармілі, птушкі паілі крынічнай вадою, прыносячы яе ў дзюбах. Ня меў гора Сьвет. Але, вось, раз спаткала яго бяда. Бегаў Сьвет па лесе, ганяўся за птушкамі. Як раптам, вецер разагнуў вяршыны дрэваў і вострае, яркае праменьне разгнула яго па вачох...

Ад неспадзеўкі Сьвет застанавіўся.

— Што за птушка зірнула на мяне? — думалася яму. — Адкуль у яе такое яснае вока, што нават у вачох пацямнела ў мяне, —

меркаваў ён і, падняўшы галаву, пачаў шукаць птушкі з ясным вокам. Доўга хадзіў ён, выглядаючы, ці не знайдзе дзе цікавай птушкі. Дарэмна клікалі яго ўсе зьвяры і птушкі, дарэмна звалі кінуць шукаць тае птушкі. Ня мог супакоіцца Сьвет. Усё хадзіў па лесе ды шукаў...

Вось, нарэшце, калі зноў загуляў вецер па вярхох дрэваў, угледзіў Сьвет яснае вока птушкі... Застукацела яго сэрца моцна ў грудзёх. Затаіў дух Сьвет і ціха пачаў падходзіць да цікавай птушкі. Здаецца яму, што сядзіць яна на высокай, высокай елцы, на самай апошняй галіне. Ня вытрымаў Сьвет і палез... Вось ён ужо на самай вяршынцы... Хістаецца елка, гнуцца пад ім галіны... Але ня бачыць гэтага Сьвет. Асьляпіла яго саўсім ясная птушка. Здаецца яму, што пераляцела яна на другую вышэйшую елку. Выцягнуў да яе Сьвет рукі, пасьлізнуўся і грымнуў у дол. Ляцеў Сьвет у дол і здавалася яму, што птушка ўжо вось-вось у яго ў руках. Разьбіўся Сьвет аб карэньні дрэваў, ляжаў у доле нежывы. Прыйшлі зьвяры, зьляцеліся птушкі наўкола яго. А ён ляжаў, ляжаў з расплюшчанымі вачыма, з усьмешкай радасьці на вуснах... А ў вачох яго ігралі праменьні далёкага сонца. Гэтак зьгінуў Сьвет, шукаючы Сонца.

XVI.

## Раніца.

Доўга ляжаў я з расплюшчанымі вачыма і ня мог заснуць. Ночка ўжо панавала над лесам. Сьвяцілі зоркі, ўзыходзіў месячык на неба. Дык, вось, яка легэнда пра Сьвета, якую я марыў учуць даўно. Ганчар і Караба смачна спалі, хутка і я заснуў...

Лёгкі туман пакрываў палянку, калі мяне разбудзіў голас Ганчара.

— Уставайце, сябра, сьнедаць! Караба ўжо яду дабыў!

Я расплюшчыў вочы.

Караба сядзеў накарачках і смажыў нейкую птушку на вуглёх. Я хутка ўскочыў на ногі. Халадок трохі прабіраў.

— Вось тутака, недалёка, ёсь крыніца, — паказаў мне Ганчар у бок лесу. — Ля асіны! — крыкнуў ён мне ўсьлед.

У лесе пачынала прачыхацца жыцьцё то там, то тутака недзе над маей галавою пачыналі варушыцца ў сваіх гнездах птушкі. Вось

і асіна. Праўда, з-пад яе карэньняў выбягаў маленькі ручайчык і некім была зроблена ямка, каб болей было вады. Добра было памыцца халоднай вадою. Адразу зрабілася неяк лёгка і добра. Недзе здалёку крычалі жоравы і гусі. Туман пачаў гінуць, нарэшце, саўсім згінуў, адплыў кудысь у гушчар лесу. Я падайшоў да сяброў.

— Вось! гатова качка! — весела гаманіў Караба.

— Сядайце! — казаў ён. — Эх, добра раніцай у лесе! — сказаў Ганчар.

— Ну! — падміргнуў адным вокам Караба Ганчару. — Давай, сябра, свайго зельля!

— А! — ўспомніў той і праз мінюту мы выпілі па дзьве чаркі добрага самагону.

— Гэта, — казаў Караба, — каб было лепей нам сёньня дайсьці да трох крыжоў.

— Што за крыжы? — запытаў я.

— А, вось, самі пабачыце, як дайдзём да іх, — сказаў Караба.

Добра пасьнедаўшы, мы, загасіўшы рэштку агнішча, крануліся ў дарогу.

## XVII.

# Старая канава.

Як тольki сонца праменьні зайгралі на кроплях брылянцістай расы, дык адразу падняўся цэлы канцэрт лясных птушак на розныя лады.

Ганчар ішоў наперадзе нас, зьняўшы шапку. Відаць была, што ён слухаў песьні птушак і цешыўся з сонца разам з імі.

Мы йшлі берагам старое канавы... Усё дно канавы было заросшы асакою і сітнягом, па якім лёгкі ветрык гнаў перад намі хвалю за хваляй. Часамі, з яго, зашамацеўшы, вылятаі качкі, з крыкам нясьліся ў даль канавы, шлёпалі ў нявідную ваду, зноў зрываліся, зноў падалі. Ні я, ні Ганчар з Карабой ня думалі страляць. А Ганчар нават раззлаваўся, што качкі ўцякалі ад яго ў такі малітвенны яго настрой, калі нават ён запомніў, што за плячмі ў яго вісіць стрэльба. Часамі, галіны асін, вольхаў і бяроз так моцна пераплятаіся над канавай з абодвух яе берагоў, што ня было відаць неба.

— Хто рабіў гэту канаву? — задаў я ім пытаньне.

— Хто рабіў? — перапытаў мяне Караба.

— А бачыце яна ідзе ад старога замку, сьледу ад якога нават ужо і не засталося, а вось пабачыце самі.

Ішлі далей моўчкі. Усё часьцей і часьцей схіляліся да нас галіны дрэваў і, нарэшце, мы ішлі праз зялёны тунэль. Прабірацца па высокай траве было цяжка і мы часта застанаўляліся адпачываць... Так ішлі мы аж за поўдзень.

— За́ра будзе паварот, дык вось і ўбачыце „Тры Крыжы“. Тутака мы і адпачынем, — загаманіў Караба.

І праўда, праз шагоў пяцьсот, канава рабіла круты заварот і зялёная заслона, якая вісела над намі, згінула. Па абодвых краёх канавы стаялі густа елкі.

— Глядзеце вун сюды! — запыніў мяне Караба, паказваючы кудысь рукою.

Я зірнуў туды і ўгледзеў сярод гушчару елак тры вялікія, аброслыя зялёным мохам, крыжы.

Я застанавіўся і глядзеў.

## XVIII.

# Тры Крыжы.

— Хто збудаваў іх? — думаў я, гледзячы на іх. — Хто? чыя нага была тутака? Чыя рука пакінула сярод дзікага гушчару лесу гэтыя крыжы? Над кім яны стаяць?...

— Гэ, вы, сябра, нешта задумаліся? Ня сумуйце! — зьвярнуўся да мяне Караба.

— Вось, хадзеце да іх бліжэй. — Мы падайшлі да самых камянёў, у якіх былі ўмацованы крыжы.

— Ну, вось слухайце, — пачаў Караба.

— Даўно, даўно, нават дзяды нашы не памятаюць гэтага году, тутака недалёка стаяў стары замак. На яго месцы мы пабываем яшчэ сёньня і легэнду аб ім я вам раскажу, а, пакуль што, аб крыжох слухайце: Паставіў гэтыя крыжы Юрка Касы. Пад сярэднім пахованы яго бацька, — князь Радзівіл, пад другім — яго другі бацька, а пад трэцім — з якога боку, ня ведаю, ён сам.

— Хто такі быў Юрка Касы? Які Ра-

дзівіл? І як у яго былі два бацькі? — зьдзіўленна запытаў я, глянуўшы на іх абодвух.

— А вось, як прыдзем да месца, дзе быў стары замак, дык я вам раскажу ўсё папарадку, а, пакуль што, давайце адпачынем дый папалуднуем, — закончыў ён, і яны пачалі рыхтаваць яду.

Я адыйшоў ад іх, прыхіліўся да елкі і думаў. Дык вось дзе хаваецца праўда пра маіх дзядоў і прадзедаў! Дык вось хто хавае праўдзівую мінуўшчыну майго народу! Дык вось хто захаваў славу і гонар старонкі мае! Ты, ты, старадаўны лес! Табе я павінен дзякаваць за ратунак нямых сьведкаў пра жыцьцё старонкі мае...

Дык ведай, цёмны лесе, ніхто не дазнаецца ад мяне пра месца, дзе хаваеш ты гонар роднай старонкі маей. Ведай! вось тутака, ля трох крыжоў, прысягаю Табе, ніхто не пазнае!...

— Сябра! А, сябра! — пазваў мяне нехта і мары мае зьніклі...

— Вось, закусеце!

Смачна пад'еўшы, мы крануліся далей.

Бывайце, Тры Крыжы, і памятайце я прысягу сваю вам датрымаю!...

## XIX.

# Муры замку.

Цяперака мы ішлі лесам. Нам прыходзілася добра глядзець пад ногі, каб не зачапіцца дзе-кольвек за карэньне і не апыніцца ў балоце. Гэтак мы прайшлі ня ведаю колькі вёрст лесам, як я пачаў прымячаць то тутака, то тамака старыя, пакрытыя зялёнай плесьняю, цагліны, спачатку рэдкія, а пасьля ўсё часьцей і часьцей... Караба, які йшоў ззаду за мною, сказаў:

— Вось, гляньце ўжо пачынаюцца сьляды замку.

Лес станавіўся ўсё гушчэй і гушчэй, раптам пашоў такі густы елавец, што нам прышлося прадзірацца праз яго, як праз лазу на балоце, добра яшчэ было тое, што балота скончылася.

— Ну, вось хутка і замак, — сказаў Караба.

— Сюды! — крыкнуў Ганчар. Мы кінуліся да яго і ўгледзелі невялічкую палянку,

ўсю пакрытую невялічкімі бярозкамі, сярод якіх ляжалі грудамі цэглы.

— Вось і замак! — сказаў Караба. — Як бачыце ўжо нічога не засталося, ну, а усё-ж месца яшчэ знайсьці магчыма.

Я абайшоў усю палянку, стараючыся хоць што-нібудзь знайсьці цікавае, і так-такі знайшоў! Гэта быў жалезны стоўп, з кальцом, які стырчэў з цаглянай кучы. Што гэта за кальцо? Дзеля чаго яно? Ці конь стаяў прывязаны да яго? Ці мажа які-нібудзь небарака канчаў свой век у мурох князявага замку? А мо красуня-жонка тамілася за здраду сярдзітага мужа-князя? А мо проста за яго закладаўся які-нібудзь запор ад брамы замку?

Маўчаць нямыя сьведкі, маўчыць стары лес, дый ці быў ён тутака, калі істнавалі харамы князёўскія? Хто ведае?

У марах зьвярнуўся я да сяброў. Ужо гарэў касьцёр і Ганчар нешта варыў у саганчыку.

— Ну што, аглядзелі? — запытаў мяне Караба.

— Але — ўсё, — адказаў я.

— Ну вось добра, пакуль будзе гатоў крупень, дык сядайце, я вам раскажу пра Юрку Касога, адсюль вы даведаецеся і аб замку і аб Трох Крыжох. Вось што кажа легэнда, — пачаў ён.

XX.

# Юрка Касы.

— Сярод глухога непраходнага лесу збудаваў сабе кназь замак, каб ніхто ня меў магчымасьці яму пярэчыць і перашкаджаць у яго справах. Было ў яго шмат замкаў. Пабудаваў ён гэты замак тутака, ян кажуць, дзеля таго, каб у ім жыла яго красуня-жонка, якая, як думаў князь, здрадзіла яго, і вось ён засадзіў сюды жонку і чакаў, пакуль яна будзе мець дзіця.

Радзіўся хлопчык. Князь прыказаў свайму дварэцкаму занясьці дзіця ў лес і кінуць тамака на зьядзеньне ваўком, а сам, сабраўшы сваіх верных халапоў, выехаў, пакінуўшы жонку ў замку, даўшы прыказ, каб сьцераглі яе.

Але як там здарылася, толькі праз гадоў два прыехаў нейкі ваяка і выкраў княгіню. Кажуць, што жонку ўкраў нейкі заморскі цар.

Праз гадоў з пяць пасьля гэтага прыехаў князь. Даведаўшыся, што яго жонку ўкралі, ён пачаў імсьціцца на людзях.

Уся вакруга стагнала ад князя. Ня было ні праходу, ні праезду нікому.

Князь гуляў усюды і нават не шкадаваў людзей дзеля забавы. Ен цкаваў людзей сабакамі, трымаў ваўкоў, каб пасьля, моцна іх раздразьніўшы, выпускаць на людзей. Завёў для пацехі свае шмат дзяўчат, якіх пасьля пацехі, аддаваў сваім слугам, а на астатак аддаваў зьвяром на яду. Людзі ўцякалі, не аглядаючыся, ад замку. Пры адным успаміне аб князю людзі ўцякалі ў лясы і там хаваліся.

Але вось пайшла дзейка, што зьявіўся нейкі чалавек, які ідзе, каб пакараць князя за ўвесь зьдзек над людзьмі.

Гэтым чалавекам быў Юрка Касы.

Пачуў і князь аб гэтым чалавеку. Часамі яго браў страх, але кожны дзень п'яны, ён не падаваў віду, што нейкі страх браў яго.

Вось раз, калі князь наладзіў вялікі баль і гасьцей было шмат, князь асабліва выбіраў самыя найгоршыя забавы. Напрыклад, ён абмазаў смалой некалькі дзяўчат і падпаліў іх. П'яныя госьці рагаталі, а бедныя дзяўчаты кінуліся ў ваду і ўтапіліся.

Вось, калі ўсіх здалеў сон, князь сядзеў папоцемку ў сваім пакоі. Сон ня браў яго.

А ў той самы час, калі князь гуляў, да замку прыбліжаўся Юрка Касы з сваімі сябрамі. Людзі яго чулі, як стагналі замучаныя

князем, і прыбеглі сказаць аб гэтым свайму атаману. І вось той сказаў:

— Браты! Сёньня павінен быць суд над князем. Божы суд будзе Божым. Я сам пайду даведацца, як нам будзе лягчэй дабрацца да замку.

І ён, узяўшы аднаго свайго чалавека, пайшоў у замак. Вось ён забраўся ў замкавы сад і пачаў падпаўзаць да вакна.

Сьвяціў месяц...

У гэты міг князь сядзеў у сваім пакоі, як раптам угледзеў, што нейкі цень прамільгнуў ля вакна. Ен паклікаў свайго дварэцкага і даў наказ, каб злавіць таго, хто меў права быць у парку ў гэты позьні час.

Слугі пайшлі.

Загрукацелі стрэлы. Праз момэнт у залю ўвялі Юрку Касога.

— Вось, чалавека, — казаў стары дварэцкі, — варта злавіла, а адзін яго сябар уцёк...

Глянуў на яго князь, дый кажа:

— Хто ты такі, сьмелы чалавеча, што адважыўся нарушыць спакой майго замку?...

— Я, — адказвае Юрка, — я той, хто прыйшоў цябе запытаць, хто даў табе права зьдзекавацца бяз літасьці над людзьмі? Я прыйшоў спытаць цябе аб гэтым і судзіць!

— Як, мяне судзіць?! — зарагатаў князь.

— Ты маеш права пытаць?! Вось, я табе

пакажу! Зьвязаць яго і ў склеп! — скамандаваў князь.

— А ты, дварэцкі, — крыкнуў ён да дварэцкага, які стаяў зьбялеўшы гледзячы на Юрку, — пастаў варту, каб нікога не дапускаць да гэтага склепу.

Ніхто ня прыкмеціў, як стары дварэцкі шапацеў: — Божа літасьцівы! гэта-ж яго дзіця!

Юрку павялі. А князь хадзіў, лаючыся, па пакоі. Нарэшце, выпіў мёду і сеў у крэсла, дзе і заснуў.

Тымчасам дварэцкі, які пазнаў у Юрцы князявага сына, зрабіў так, што той уцёк.

Князь спаў...

Раптам адчынілася вакно і ў пакой улез Юрка. Ен аглядзеўся і ўбачыў князя. Хацеў забіць яго, але пасьля разьмеркаваў і, забраўшы ў князя з-за пояса шаблю і пістолі, ўцёк, напісаўшы князю пісьмо.

Толькі ўцёк з пакою Юрка, як усхопіцца князь, ды закрычыць:

— Дзяржэце яго! Дзяржэце! Агню!

Прыбеглі спалоханыя людзі са сьвечкамі, глядзяць, князь трымае нейкую паперу ў руцэ.

— Чытай! — грозна сказаў князь, даючы дварэцкаму паперу.

Той прачытаў: «Выбачай, княжа, што ня будзіў. Замест сваіх пісталетаў і шаблі, якія

ад мяне адабралі твае людзі, бяру твае. Да спатканьня !».

Як толькі дачытаў гэта дварэцкі, як схопіць яго князь за горла:

— Дык ён уцёк, уцёк, а я хацеў над ім пажартаваць! Хацеў, каб мае госьці паглядзелі, як князь частуе тых, хто хоча яго судзіць! І я пазбавіўся гэтае прыемнасьці! Як ты, гадзе, яго замыкаў! — наваліўся князь на старога дварэцкага.

Зьбіўшы старыка, ён крыкнуў:

— Пасадзіць яго, замест таго злодзея!

Зьбітага старыка павялі, а ашалелы князь хадзіў па пакоі.

Раптам са ўсіх бакоў загрукалі стрэлы, пачуўся крык і ў пакой уляцелі нейкія азброеныя людзі.

Князь ад неспадзеўкі гэтак спалохаўся, што думаў, быццам гэта нядобры сон, але вось увайшоў Юрка і сказаў:

— Вось і я, пане князю, выбачайце што ўвайшоў тады бяз вашага ведама, але вось, як бачыце, прыйшоў за вашым адказам на маё пытаньне.

— Хто ты? — запытаў яго князь.

— Я той, хто сабраў, прытуліў тых людзей, якія ўцякалі ад твайго зьдзеку; я той, хто карае ўсіх тых, якія ўвесь свой век п'юць, ядуць, нічога ня робяць і жывуць чужой кры-

вёю, чужою працаю і потам... Я — Юрка Касы! — прагрымеў на яго запытаньне Юрка...

Праз мінюту ў пакой прынясьлі зьбітага дварэцкага і палажылі яго на падлогу.

— Слухайце людзі, — ледзьве прагаманіў стары, — слухайце людзі, — пачаў ён, — гэта князяў сын, — паказаў ён рукою на Юрку, — калі ён радзіўся, дык князь, думаючы, што гэта не яго сын, сказаў мне, каб я яго кінуў ваўком, але я аддаў дзіця свайму брату, каб той выхаваў яго ў сябе. А цяпер, цяпер, выбачай, княжа, я выпусьціў яго, я не хацеў, каб ты быў сыназабойцаю. Гэта твой сын!

Сказаўшы гэтыя словы, старык упаў няжывы.

— Што я чую, — шаптаў зьбялеўшы князь, — мой сын, гэта мой сын! не, ня можа быць! Ты брэшаш, стары, — кінуўся ён да старога, але Юрка загарадзіў яму дарогу.

— Спыніся, княжа! — спакойна сказаў ён, — гэта суд Божы над табою і нада мной...

Ніхто ня прыкмеціў, як князь выбраў з-за пояса пістоль і раптам выстраліў у Юрку са словамі: — Памры, хоць ты і сын!

Кінуліся людзі да падаўшага Юркі, а рэшта да князя.

— Спынецеся! — сказаў ранены ў грудзі Юрка.

— Слухай, княжа! Я дарую табе гэты

стрэл! Памятай, хоць па маёй сьмерці — зьмяні жыцьцё...

І цуда зрабілася — князь кінуў пістоль, кінуўся на калены прад Юркай, схапіў яго за ногі.

— Сыне, сыне! даруй бацьку! — плакаў ён, а Юрка ціха паміраў.

— Даруй, сынок, даруй! — плакаў бацька.

Юрка маўчаў, пасьля апошні раз падняў вочы ўгару і сказаў: — Дарую!

І ў той-жа час заснуў вечным сном...

З таго часу зьмяніўся князь. Раздаў усю зямлю сялянам, адбудаваў спаленыя вёскі, сабраў усіх хворых і бедакоў да замку і быў бацькам для ўсіх. Калі прышла яго канчына, шмат людзей плакала па ім і, па яго завету, пахавалі яго сярод магілак Юркі і старога дварэцкага, які быў другім бацькам для Юркі.

Караба скончыў. Крупень быў гатовы.

Але ніхто ня браўся за яду. Усе былі пры сваіх думках.

— Чаго зажурыліся? — весела загаманіў Караба. — Гэта прайшло ўсё, а вось крупень стыне! — казаў ён, дастаючы лыжкі.

— Бярэцеся! — скамандаваў ён і мы дружна прыняліся есьці.

Вечар ужо надходзіў, калі мы пайшлі далей.

— Абы да Базылёвага хутара дабрацца, а там заначуем, — сказаў Ганчар.

Хутка мы выйшлі на грэблю, па якой мусіць мала хто хадзіў, а мо мала хто і ведаў пра яе істнаваньне...

XXI.

## Затануўшая званьніца.

— Ведаеш што, Дзяргач — ціха пачаў гаманіць Міхась — ці ведаеш ты тую легэнду, якая ходзе тутака паміж жыхароў пра затануўшую званьніцу?

— Не, ня ведаю — адазваўся я, раптам адарваны ад сваіх думак.

— Ну, дык ось слухай... Калі нашую старонку пакрывалі глухія гушчары лесу, калі кожны гаспадар жыў асобна, ня так як цяпер, дык ось ля гэтага берагу, як раз проці нас, калі яшчэ ня было ў гэтым канцы возера, нейкі князь, кажуць Радзівіл, задумаў будаваць царкву. Раней за ўсё работнікі збудавалі званьніцу. Зацягнулі на яе вялікі звон і ось князь казаў зазваніць. Ён хацеў паслухаць, ці добры гук у гэтым звоне. Было гэта, як кажуць, сярод глухой ночы якраз у поўнач.

А трэба сказаць, што ў гэты час возера сярдзіта шумела і хвалі хадзілі па ім вялікія.

Сабралася шмат князявых знаёмых каб паслухаць гук звону.

Прагудзеў першы гук, паплыў над лесам, возерам далёка, далёка...

Ад гуку яго прачхнуліся ад сну птушкі, спужаліся зьвяры; прыслухаліся да яго нават далёкія жыхары...

Звон гудзеў... Здаволены князь узьлез на званьніцу, каб самому папрабаваць званіць і ось толькі ўзяўся ён за вяроўку, якая была прывязана да біла, і ўдарыў першы раз, як здрыганулася зямля, і ўсё што было на ёй і наўкола, правалілася няведама куды і ўсё гэта месца заліла вада.

Шмат людзей кажуць, што і цяпер па начох іншыя людзі чуюць, як гудзіць звон дзесь пад вадою...

Дзеля таго і маець возера ў гэтым месцы нейкую асаблівую форму, быццам дадатак да рэшты возера.

— Мяне бярэ страх! — сказала Ганка, прытуляючыся да брата...

— Чаго там! — адказаў ён, і зноў мы змоўклі...

Дык калі ты ёсьць там, вялікі звон, дык хутчэй прагудзі! Хай учуюць цябе зноў, хай зноў узбудзіш ты гукам сваім птушак уночы, мо' да іх цяпер прыстануць і жыхары мае старонкі! Прагудзі хутчэй, таемны звон!

Плешчуць хвалі, шапоча сітняг і чую я, як быццам дзесь ужо пачаў гудзець цудоўны

звон... Усё мацней і мацней, яму адазваўся лес, загудзеў і панёсься, будзячы ўсіх ад сну...

— Гэй, уставайце, браточкі! — чулася ў гэтым гуку.

Ночка прайшла... Зорка раніцы зайграла, хутка ўзойдзе сонца, разгоне мары ночы!

Дык чакайце, людзі!

Прыслухвайцеся чутка ўночы, ці не пачаў ужо звон гудзець!...

## XXII.

# Грымоты.

Хутка прайшла ночка.

Загарэлася неба і праз хвілю праменьні сонца пагналі летні туман у гушчар лесу, дзе ён згінуў сярод галінаў.

— Добры будзе дзянёк! — глянуўшы на неба, сказаў Міхась.

— Цяпер добра было-б трохі заснуць, — скончыў ён гутарку, ўстаючы з месца.

— Ды чаго там, лажэцеся, а я пайду да хаты, — сказала Ганначка. — А пасьля пад вечар я прыду ды вам есьці прынясу. Дык бывайце здаровеньнія! Глядзеце, не пажанецеся тутака, бо вун Пухавіцкія дзяўчаты з таго боку пазіраюць! — пагразіла яна нам рукой, засьмяяўшыся і хутка схавалася ў гушчары лесу.

— Ня зьбіся з дарогі! — крыкнуў ёй Міхась усьлед.

— Давай, сябра, пасьпімо! — зьвярнуўся Міхась да мяне.

— Яно й можна, — згадзіўся я.

— Дык трэба нам паспаць добра, ды і на мягкім, — сказаў Міхась, падміргіваючы. — Ось, для гэтага давай сябра аер ламаць!

Мы дружна прыняліся за працу і не агледзеліся, як наламалі шмат аеру, на якім расьцягнуліся і не пасьпелі аглядзецца, як заснулі. Праз сон я чуў, як сонца моцна пякло, але змога брала сваё...

Не памятаю, ці доўга мы спалі, як раптам мяне разбудзіў нейкі ўдар па галаве.

Я расплюшчыў вочы. Што за праява?

Хтось накрыў нас цэлай купай галін.

— Гэй, хто там? — пачуўся голас Міхася. Мусіць і яго таксама разбудзіў удар альховых галін.

Мы выбраліся з-пад галін і зьдзіўленна паглядзелі адзін на аднаго.

Было цёмна. Вецер гудзеў.

— Ось яно што! Шчасьліва абыйшлося! — памахаўшы галавою, сказаў Міхась.

— Глядзі, сябра, гэта вецер зваліў на нас тую вялікую вольху, пад якой мы варылі рыбу. Добра, што зачапіла толькі галінамі, мусі моцна мы спалі, калі ня чулі, як паднялася бура, — скончыў ён, азіраючыся наўкола.

Неба было пакрыта цёмнымі хмарамі, вецер хістаў і рваў галіны, лісьцьцё з дрэваў, высока паднімаў іх угару і кідаў у хвалі ва-

ды, якія гарамі ішлі адна за аднэй і з пенаю кідаліся на бераг...

Гнуўся да самай вады зялёны сітняг...

Ось, сьціх вецер на момэнт...

Як нажом разанула маланка хмары ў небе і моцны ўдар пяруна пракаціўся, патрасаючы, здаецца, ўсю зямлю.

Закапалі вялікія кроплі дажджу, спачатку рэдка зашлёпалі па вадзе і сьцёблах дрэваў, а пасьля раптам быццам хтось адкрыў якуюсь заслону, перашкаджаўшую дажджу, і той лінуў як з вядра...

— Хавайся! — пасьпеў мне крыкнуць Міхась, як зігнула маланка і грукнуў такі ўдар пяруна, што аж у вушох зашумела...

Гуляла бура! Стагнаў лес пад напорам ветру, ламаліся галіны, сыпаліся градам лісты. Ня было зьлітаваньня! Усё мацнеюць і мацнеюць удары пяруна, зіхацяць маланкі адна за аднэй...

Равуць хвалі, зьбіваюць пену...

Здаецца, хочуць яны наляцець, затапіць зялёны лес, які быццам бровы насунуў і грозна гудзіць ім у адказ.

А над імі бушуе чорнае неба, хлешча дождж...

Гуляй мацней бура!...

Пануй над небам, лесам і вадой!...

Хай, хто трус хаваецца хутчэй! Хто моцны — выходзь!

Чуецца ў вас ветру вызаў...

— Гэй, сябры! Сюды на дапамогу! Хай маланкі зьяюць, грукоча пярун! Хай сьмерць наўкола пануе! Ня страшна нам! Мы вызаў прынялі! — гудзіць яму, ў вочы гледзячы, лес...

Ідзе бойка...

Плача здрасаваны, заліты вадою, сітняг...

— Трымайся, сябра! — лес яму гудзіць...

Грукоча пярун, трашчаць дубы, бярозы, сосны, вольхі...

Хутка пройдзе бура...

Зноў узойдзе сонца і лячыць тады будзе свае раны сітняг і стары лес.

Ось слабей грукоча пярун, сьціх дождж. Вецер пагнаў далей цёмныя, агнём багатыя, хмары. Ось, блеснулі праменьні, зноў засьмяялася сонца, іграючы тысячамі агнёў у кроплях дажджу на лістох галін.

Сьціхла бура.

Мы, змокшыя да касьцей, пайшлі да хаты, цераз, пацішу ўжо гудзеўшы, лес...

Сьмяялася сонца. Птушкі наўкола зноў весела сьпявалі...

---

## XXIII.

# Альбіна.

Чаму я ўспомніў аб ёй у гэты момэнт.

Я добра і сам ня ведаю, але ось успомніў і жудасны жаль здавіў грудзі і сэрца.

Гэта было даўно...

Тады сонца так ярка сьвяціла, весела птушкі сьпявалі аб нечым цудоўным. Лес гаманіў. Здавалася — усё створана для твайго жыцьця.

Ярка сонца сьвяціла, як мора жыта выглядала і хвалі чыстага золата хадзілі па ім, а сярод іх ішла Альбіна...

Любая дзеўчынка мая, дзе ты цяпер?

Сэрца біцца перастала. Я глядзеў на яе, як на багіню і тыя краскі васількоў, што яна выпусьціла з рук, я падняў, схаваў у сябе на грудзёх...

А вочы, вочы, якім сьвяціліся яны агнём!..

Куды звалі яны?

Ад вачэй я адарвацца ня мог...

А ўся яна была падобна да тае багіні хараства, якіх я бачыў у музэі...

Дык ось яна дзеўчына нашых лясоў, нашых палёў...

Штодзень хадзіў я ў поле.

Вочы мае шукалі сярод хваляў жыта галоўкі са стужкай чырвонай у касе...

Чуў я, як моцна пакахаў я яе ўсім сэрцам сваім.

Тады сонца ярка сьвяціла.

А ночкай, як цяпер, я бачу яе перад сабой. Закрыла пуком красак пачырванеўшы твар, калі прасіў яе:

— Альбіна, прыйдзеш на рэчку ўночы?

Доўга моўчкі стаяла, а пасьля глянула на мяне і ціха сказала: — Добра!

Дзіўная ночка была. Месяц прыгожа сьвяціў, задрамаў у вадзе сітняг, аб чымсь шаптаўся лес з вадою...

Я чакаў яе...

Але ось і яна...

— Альбіна, ты?

— Я! — ціха сказала і сьмела да мяне падайшла.

Мы сядзелі на камені шырокім, над вадою і чулі, як хвалі беглі, як лес казку казаў, гадалі на зоркі... Я вочкі яе цалаваў...

Яна была мая. Я не аддам яе нікому, ні

людзям, ні небу, ні лесу; адзін Бог і то сілком можа адабраць яе ад мяне!

Сьвяціў нам месячык з высокага неба, сьмяяліся нам зоркі...

Русалкі з вады краскамі кідалі, песьні пеялі і казку казаў нам сітняг.

Так было ночкай.

Яна была мая!...

Дзеўчынка, любая мая, дзе ты цяпер? ці гарыш у вечным агні, ці гуляеш у Божым раі?...

Я ведаю, тутака сярод нас яе на зямлі няма. Яе адабралі русалкі ад мяне...

Не, не, далей успамінаць я не магу...

Альбіна! Кветка мілая мая!

Ці чакаеш мяне Ты, там у сябе?...

Мы ішлі далей.

---

## XXIV.

# Сустрэліся.

Прадзірацца праз лес цяпер было горай, як раней, бо намокшыя галіны кожны раз крапілі нас сьцюдзёнымі кроплямі.

— Ось табе і другі дождж! — весела загаманіў Міхась. — Толькі тая розьніца, што ня з хмараў, а з галін палівае...

Як-нібудзь фыркаючы, ішлі далей...

Раптам недзе з боку, саўсім блізка бахнуў стрэл і каб крышачку, дык забіты цецярук упаў-бы Міхасю на галаву.

— Ось дык праява! — сказаў Міхась, падымаючы цецярука, але ў гэты момэнт аднекуль зьявіўся чорны сабака і пачаў брахаць на нас.

Праз момант пачуліся цяжкія крокі і на сьцежку выйшаў чалавек.

Скураная яго адзежа блішчэла ад макраты і дзе-ня-дзе папрылілала да яго лісьцьцё.

— Вы што, дзядзька, за птушкай? — зьвярнуўся да яго Міхась.

— Але, — адазваўся той, адганяючы ад нас вельмі пасьмялеўшага сабаку, які, ўглядзеўшы свайго гаспадара, пачаў кідацца да нас.

— Жук, сюды! — паклікаў ён сабаку. — Сьціхні, каб цябе ваўкі!..

Але Жук ня сьціхаў і яшчэ больш заліўся, мусіць вельмі быў скрыўджаны тым, што забітая птушка дасталася ў чужацкія рукі.

Я прыглядаўся да чалавека і дзівіўся: штось знаёмы твар і ніяк ня мог уцяміць, якім парадкам ён мог апыніцца тутака...

Але мусіць чалавек угледзіў, што я нешта мяркую і мо' думаючы, што я яго пазнаў, усьміхаючыся зьвярнуўся:

— Што, не спадзяваліся мяне сустрэць тутака, пане Дзяргач?

— Пётра! — вырвалася ў мяне, — якім цудам?

— Дый ось, дзякуючы Богу, бачыш жывы і здаровы! — адказаў ён.

Мы абняліся, як родныя. Я пазнаёміў яго з Міхасём.

Гэта быў той самы Пётра, якога лічылі забітым усе нашыя сябры, нават і я сам.

Але ўсё-ж у брахню людзей я ня верыў. Як мог прапасьці такі чалавек, як Пётра?

І, ось, думкі мае спраўдзіліся: ён жывы і цяпер мы ішлі ўтрох, весела гамонячы...

На хутары нас сустрэлі сьмехам:

— Што пакупаліся? Дасталі лазьню? — сьмяючыся казаў Міхасёў бацька.

— Нічога! — адказвалі мы ўсе, сядаючы за стол...

Па абедзе мы выйшлі пасушыцца на сонцы і Пётра пачаў:

— Ось, паслухайце, мае браточкі, што бачыў і што перажыў я, пакуль папаў сюды, ў родны лес, ад людзей захаваўся... і ён пачаў свой расказ...

## XXV.

# Хто ты?

Я йшоў шляхам жыцьця, змарыўся, прысеў ля краю дарогі пад старой бярозай... Язык мой высах.

Я хацеў піць і ніхто ня даў мне вады...

Я ўсё йду і йду без канца і краю, дарогі няма.

Я шмат чаго бачыў:

Я бачыў вёскі. Хаты ў іх былі крыты глíняным чарап'ём, сьцены збудованы былі з цэглаў, шыбы блішчэлі як люстры, а ў сярэдзіне тых хатаў было чыста, ціха, спакойна і жылі ў іх багатыя людзі.

Хто яны, я ня ведаў. Прасіў у іх хлеба і мне давалі пірага, прасіў у іх вады — давалі віна...

Доўга глядзелі яны на мае пабітыя ногі, на падраную адзежу,ківалі галовамі. Пыталі мяне: — Хто ты? Адкуль?

— Я адтуль, — адказаў я і йшоў далей.

Я ня ведаў добра, адкуль я і хто я. Я

быў чалавек, які павінен ісьці ўсё сваё жыцьцё сваім шляхам і толькі сваім, бо іншага ў мяне няма...

Я йшоў далей і шмат чаго бачыў...

Я бачыў вёскі: Хаты былі крыты саломай, сасновыя былі сьцены ў іх. У сярдзіне іх было чорна, цёмна, бо праз маленькія шыбы ледзьве пранікаў сьвет Божы. У хатах гэтых жылі людзі такія-ж абдзёртыя, як і я, і яны ня дзівіліся, гледзячы на мяне.

Я прасіў хлеба — давалі мне скарынку, па якую цягнулася маленькая гразная ручка плакаўшага дзіцяці, і я ня мог браць гэтай скарынкі, ніжэй апускаў галаву і адходзіў...

Такіх вёсак было болей. І мала не ля кожнай такой вёскі ў канцы стаялі высокія будынкі з харошымі сьценамі, стрэхамі і вокнамі і жылі там людзі з белымі тварамі і рукамі, ў багатай адзежы.

Яны сядзелі на бальконах будынкаў сваіх, пілі віно, весела таманілі, сьмяяліся... Я падходзіў да плоту, нізка кланяўся ім, стагнаў, прасіў...

Людзі сьціхалі, пераглядаліся між сабой, паціскалі плячмі, нібы дзівіліся: як сьмеў я перашкодзіць іх веселасьці і гналі мяне слугі іх, рвалі адзежу і цела маё іхнія сабакі...

Я адходзіў ад плоту і йшоў далей...

Я йшоў далей... Цяпер я змарыўся. Сілы

няма ў мяне ісьці далей... Я сеў ля краю дарогі, ля старой бярозы...

Я шмат зямлі схадзіў... Мяне шмат хто пытаў: — Хто ты? Хто ты?

Хто ты? Ха, ха, ха! Сьмешныя людзі! Ці вы ня бачыце, хто я? Ха, ха, ха! Сьмешныя людзі! Хто я... Прыгледзьцеся добра.

Ось з апушчанай галавой за плугам, які цягнуць добрыя коні па добрай чорнай зямлі, ледзьве пасьпявае за сытымі коньмі, худы з чорным тварам, як сама зямля, чалавек...

Ось, таксама потам абліты ідзе за сахой, якую ледзьве цягне худы, як шкілет, маленькі конік, па пяску...

А ось, у кайданох закуты, зьбіты, з крывёю застыўшай на твары ідзе пад канвоем...

Спытайце — хто ты?

А пабачце сюды: тутака некалі былі вёскі, былі хаты, а цяпер вецер хістае на гэтых мясцох крапіву і дзікую траву...

А дзе ўсе яны, што калісь жылі тутака ў хатах?

Глянь, бачыш: адзін за адным з торбамі за плечамі, з кіямі, ледзьве цягнуцца сонцам апаленыя, дажджом палітыя, ветрам і людзьмі ганімыя...

Гэта яны! Тыя! Ха, ха, ха! І дагэтуль вы ня ведаеце і пытаеце: — Хто ты?

Ды я той! Той, што ня мае прытулку

на роднай сваёй зямельцы, ў роднай хаце сваёй не гаспадар!

Я той з каго ўсе сьмяюцца і пры жыцьці і па сьмерці, над мовай маей, над звычаем, над усім сьмяюцца!

Я той, хто капаў канавы, строіў чыгункі, фабрыкі і нават кайданы рабіў з жалеза, каб самому адзець іх на рукі і ногі...

Я усё той самы — сын беднай маці-Беларусі...

Дык ня пытайце мяне болей людзі: — Хто ты? Чуеце: я — Беларус!

Цяпер я змарыўся, бо доўга йшоў шляхам жыцьця.

Бачыце — прысеў ля краю дарогі, ля старой бярозы...

Ня пытайце болей... бо ведаеце самі, хто я...

---

XXVI.

## Шляхам далей.

Ён скончыў.

Цяжка зрабілася на сэрцы. Сум апанаваў нас усіх...

— Цяжка табе, браце мой родны! Я бачу, ох як цяжка. Але што зробіш...

Выпала нам на долю нясьці цяжкі крыж жыцьця. Ну што-ж, дык будзем нясьці! Будзем да канца пад цяжарам яго йсьці шляхам сваім, хоць цярністы гэты шлях! Але з горда паднятай галавой пойдзем, браце, мы далей! Пойдзем!

Хай сьмяюцца, хай гоняць! Але мы ня сойдзем з дарогі!

Ня сойдзем! Не, ніколі!

Хай гуляюць маланкі, грухацяць пяруны, нам усё роўна...

Крыж свой цяжкі панясём наперад...

Панясём на тую гару дзе, быць можа, на ім нас-жа раскрыжуюць, як раскрыжавалі памятаеш, браце, Яго...

Мо' на касьцёх нашых калісь паўстане край наш родны, прачхнецца брат наш цёмны і збудуе хату, ў якой сам запануе...

Дык веры болей, моцы болей і пойдзем, браце, шляхам нашым да канца...

Хай крыж цяжкі!

Але будзе некалі хтось шляхам гэтым горда, сьмела ісьці бяз крыжа... І будзе гэта пэўна ісьці той, хто шляхам нашым за намі пойдзе!

Дык ня сумуйце, браточкі, што пытаюць вас «Хто ты?»

Хутка прыйдзе гадзіна — нас спатыкаць будуць здалёку, дзьверы ўва ўсіх хатах адчыняць, запрашаючы нас.

А ці зойдзем тады мы да іх?...

Будзем жыць жыцьцём сваім, сваім правам сьветлым як сонца, магутным, як бура!

І ня трэба будзе болей ні кіёў, ні торбы!.. Будзем вольна жыць!

Ось чуеце, браточкі: лес шумець пачынае, штось гамоне, кудысь кліча!

Чуеце??...

Кліча ён нас на шлях наш...

Моцна кліча!

Ківае зялёнымі галінамі, нібы паказаваючы дарогу...

Дык уставайце браты! Уставайце, дось

сядзець! Бярэм, пакуль што, торбы, кіі і гэй на шлях!

Ужо там зьбіраецца грамада і крыж цяжкі нясуць...

Ледзьве яго паднялі на плечы худыя...

Дык гэй, брацьця!

Хутчэй на дапамогу ім!

А там хоць згінем пад крыжам, але данясём яго да канца, ня кінем сярод дарогі...

Хай хоць на нашых касьцёх, але адродзіцца край наш родны...

XXVII.

## Расстаньне.

Ужо сонца пачынала садзіцца, калі я зварушыўся і пачаў зьбірацца ў дарогу.

Міхась і Пётра прапанавалі мне перанавачаваць, але я, ня гледзячы ні на якія прапановы, цьвёрда рашыў выйсьці ў дарогу з апошнімі праменьнямі сонца.

Міхасёў бацька прапанаваў ехаць канём і пасылаў Міхася запрагаць, але я стаяў на сваім, кажучы што халадком будзе добра ісьці.

Ось ужо зайграў апошні прамень на вярхох дрэваў і я пачаў дзякаваць сваім сябром за прытулак і шчырасьць.

Міхась, Пётра і Ганначка пашлі мяне праводзіць да вялікай грэблі.

— Калі-ж вы цяперака зайдзецеся да нас? — казала сумна Ганначка, глянуўшы мне ў вочы.

— Добра і сам ня ведаю, ось як будзе справа, дык забягу — адказаў я.

— Усё справы, — ўздыхнуўшы адказала яна, — а да мяне дык справы нікому няма...

Я зьдзіўленна паглядзеў на яе, але яна, махнуўшы галавой, сказала:

— Давайце засьпявайма —

— А і праўда, — адазваўся Пётра.

— Трэба дзядзьку Дзяргача праводзіць сьпевам нашым...

— Міхась, пачынай! —

Праз момэнт тры моцныя, маладыя галасы засьпявалі...

Рэха ўторыла ім...

„Не загіне край забраны покі будуць людзі“...

Нясьліся па лесе, плылі ў даль сьвятыя словы, і сум браў мяне!..

Але вось і старая грэбля.

Моцны сьціск далоняў сяброў на разьвітаньне, і я астаўся адзін. Паглядзеў ім усьлед і крануўся далей...

## XXVIII.

# Гук грому.

Адзін ішоў я па грэблі.

Была ночка.

Месячык сьвяціў прыгожа, зьялі зоркі агнямі, лёгкі ветрык цалаваў лісты галінаў...

Было ціха...

Лес быццам задрамаў, углядаючыся ў яскравае неба. Дубы, бярозы і ліпы прытуліліся да высокіх соснаў і шапталі ім таёмныя казкі.

Цудоўным выглядае ў гэту пару лес і той, хто часта бываў у ім, толькі той любіць яго...

Няма такіх фарбаў, каб перадаць усю прыгожасьць палескіх лясоў!

Часам у гэтай жудасна-прыемнай цішы зьявіцца аднекуль, патрасе ўсё паветра, гук грому...

Задрыжаць дрэвы, зашуміць вецер мацней і зноў усё сьціхне...

Гэй! Хто паслаў цябе? Хто казаў табе праносьціся над лесам заснуўшым?...

Мо' хочаш ты, каб лес пачаў гудзець?

Каб шум яго — братоў маіх разбудзіў?

Каб уставалі ўсе і гэтай ночкай сьвятой і ціхай, на раду сабраліся?

Ціха ўсё...

Няма адказу на запытаньне маё, але сэрцам я чую — гэта так!

Ен прыляцеў да нас у цёмныя лясы, каб падняць, каб узварушыць нас! Бо час настаў!

Хутка пройдзе ночка і сонца праменьні заблішчаць у кроплях расы.

Дык чаго-ж ты сьціх?

Чаго-ж не грукаціш мацней, чаго маўчыш?

Ціха ўсё...

Лес сьпіць...

А неба, неба далёкае з яскравымі зоркамі штось гамоне, кудысь кліча, заве...

Небу высокаму відней: недзе далёка зьбіраюцца хмары вялікай грамадой і хутка ўжо над лесам, што сьпіць, загрыміць, пабудзіць усю старонку, сьвятарны гук грому...

XXIX.

## Ціха ўночы.

Ціха ўночы. Зоркі гарацьь высока—высока ў цёмным небе, глядзяць адтуль на цёмную зямлю, на якой панура раскінуліся вёскі, гарады, сярод якіх нядоля пануе, нуда і злосьць, на якой сьлёзы льюцца рэкамі і морам бушуе край...

Чаму так хараша ў небе?

Чаму?

Чаму няма там ні сумных гарадоў, ні вёсак, ні сьлёз? Чаму там вечна пануе спакой і нейкая радасьць ахопіць душу і сэрца, калі глянеш у далёкае неба, пакрытае зоркамі і нейкі сум апануе, калі па ім хмары бягуць і плачуць даждом?..

А выйдзе месячык поўны на неба, агорне ціхім сьветам цёмную зямлю...

Маліцца тады жадае душа, плакаць аб нядолі, аб нудзе, што вечна над сэрцам пануе...

Ціха ўночы. Гарацьь зоркі...

Яны бачаць усё, ім відаць з вышыні, дзе

ўсе яны, мае дарагія, па кім душа і сэрца баліць...

Дык гэтай ночкай маліцца буду я, каб пачуў мяне Бог...

Каб дапамог мне ўратавацъ маю старонку ад нядолі, каб вёскі яе, гарады былі поўны шчасьця, лепшае долі, нябеснай цішыні...

Каб мір панаваў назаўсёды!

Каб болей ня чуў я, ня ведаў, ня бачыў ні сьлёз, ні крыві...

Божа! У гэтым Ты нам дапамажы! Каб было так ціха, як уночы...

Ціха ўночы.

XXX.

## Ярэм Дуб.

Ужо было далёка за поўнач, калі я, нарэшце, з ґрэблі схіліў на знаёмую сьцежку, якая вяла да хаткі лясьніка Ярэма Дуба. Прайшоўшы шагоў з пяцьсот, паказалася хата.

Нізкая хатка быццам урасла ў зямлю, быццам старалася схавацца ад людзкога вока, але той, хто ведаў да яе чуць прыкметную сьцежку, знаходзіў яе і заўсёды спатыкаў у ей шчыры прытулак.

Было так і гэтым разам.

Падайшоўшы да нізкага вакна, я нагнуўся і стукнуў два разы...

Пачуўся ў хаце брэх сабакі а за ім, быццам з-пад зямлі, пачуўся голас:

— Дзяргач, заходзь!

Гаспадар быў, як відаць, у хаце і ня спаў ужо. Я абайшоў хату, адчыніў дзьверы, і нахіліўшыся, ўлез у сялібу Ярэма.

— Як маецеся, дзьдзька Ярэм, — павітаўся я з ім.

— Як бачыце, жыву ды гасьцей чакаю, — адказаў ён, моцна сьціснуўшы маю руку.

— Але як гэта вы адважыліся ісьці адзін уночы гэтулькі вёрст! — ківаў ён галавой.

— Ну, сядайце, дый ось закусеце, чым Бог паслаў, дый ось падмацуйцеся ялаўцовым настоем, — гудзеў ён басам, наліваючы ў шклянку нейкую цёмную жыжку.

— А вы што-ж самі? — зьвярнуўся я да яго.

— Я ўжо, але для дарагога гасьця — пацягну, — адказаў Ярэм.

Я выпіў. Прыемная цяплыня прайшла па ўсіх, як кажуць, жылках...

Мы пілі і закусалі, гамонячы.

Ярэм Дуб быў вельмі цікавы чалавек. Ен належаў да тых яскравых тыпаў, якіх захаваў у сваім гушчары лес, якіх лёс жыцьця змусіў прайсьці школу жудасную, цяжкую...

Ярэм быў высокі, спрытны і досіць малады на свае гады. Чорная барада рабіла яго твар суровым, а вочы заўсёды гарэлі нейкай загадкай для тых, хто яго ня знаў. Аб такіх кажуць: «ня дай Божачка спаткацца з ім у лесе!» Але я сам прыйшоў да яго і, нават, ідучы па грэблі, меў салодкую думку, што спаткаю яго . . .

— Як справы, сынок? — зьвярнуўся ён да мяне, — ня злуйце, што гэтак вас назы-

ваю, але сэрцам чую, што ўсе вы мае дзеці,— казаў ён, гледзячы на мяне.

— Чаго-ж злавацца, дзядзька, вы маеце права і этак мяне называць, здаецца не адзін год ужо знаемся; — а дзе-ж Карп, Сымон? — запытаўся я ў яго.

— Нешта вы не пра ўсіх цікавіцеся, глядзеце, ня дасьць нам з вамі добрага сьнеданьня, што пра яе запомнілі, — засьмяяўся Ярэм, міргнуўшы ў цёмны бок хаты, дзе нехта чымсь шамацеў.

Я пачуў, як зачырванеў, але гэтага ніхто ня бачыў...

— Вылазь! вылазь, Алеся! дый рыхтуй нам чаго смачнага, — сьмяючыся гудзеў Ярэм.

— Як маецеся, «Елачка»? (гэтак у хаце празывалі Алесю), — зьвярнуўся я ў цемнату хаты, адкуль ішло шаматаньне.

— Цяпер ужо няма чаго пытацца, зараз самі пабачыце, — пачуўся адтуль прыемны галасок, нібы скрыўджаны, і хутка дзеўчына падыйшла да нас.

У хаце пачынала сьвятлець.

Пачыналася зарніца.

— Ось, і я, — сказала яна, падаючы мне руку.

Я павітаўся і зьдзіўленна глядзеў на яе.

— Што не пазналі, думалі ўсё, што

«елачка» застанецца «елачкай», а тут ось ужо і праўдзівая елка, — сьмяючыся казаў Ярэм.

— Гады бяруць сваё,—дадаў ён, устаючы.

— Ну, «елачка», ты тутака займі гасьця, а я зірну на хлапцоў, ці ўсё ў іх там добра, цый звары што-кольвек, а мо' адпачыць хочаце, дык яна вам пакажа месца, — сказаў Ярэм, ужо выходзячы з хаты.

Я глядзеў на Алесю і ня верыў сваім вачам. За два гады часу яна выглядала гэтак прыгожа, што мне здавалася, быццам яе нехта падмяніў. З маленькай «елачкі» яна зрабілася стройнай харошай дзяўчынай...

У чорных прыгожых вачох было столькі нейкіх незразумелых думак, далёкіх, глыбокіх, як мора. Чорная каса ляжала на чырвонай станусе.

Яна была вельмі прыгожая.

Гэтакую прыгожасьць хаваў ад людзей лес.

— Што, мо' не пазнаецё мяне, што гэтак глядзіцё на мяне? — зьдзіўленна глянуўшы на мяне, сказала яна.

— Не, ня тое, — адказаў я, — але за гэты час вы, «елачка», зрабіліся саўсім ужо, як мае быць, дзеўчынай, а я, ось, прынёс вам, як заўсёды, стужак, цукерак і казкі, а вось бачу, што трэба ўжо ня казкі, а больш паважныя кніжкі, — адказаваў я ёй.

— Гэта нічога, давайце стужкі, цукеркі

і казкі, я ўсё гэта люблю вельмі, — засьмяяўшыся, адказала яна, прымаючы ад мяне падарункі.

— Кніжак іншых я дастану ад Карпа і Сымона, — казала яна далей.

— Ну, я бачу, вы змарыліся. Хадзем, я вас завяду на сена, — сказала яна, бяручы мяне за руку.

Мы ўсталі і выйшлі з хаты.

Ужо першыя праменьні сонца весела гарэлі залацістым агнём па касматых шапках соснаў, грабоў і дубоў.

Лёгкі ветрык патроху калыхаў галіны бярозкі і нейкі вельмі прыемны сьпеў птушак стаяў у паветры...

— Чуеце, як заліваюцца, — паварочваючы да мяне сваю галоўку, сказала Алеся.

Мы прыселі на бервяно.

— У нас тутака прыгожа, вельмі прыгожа, асабліва раніцай, калі ўсё пачынае ажываць пасьля ночы...

— Ну, няма што вам дакучаць, ідзеце ось у тую пуню, тамака сьвежае сена, дый адпачывайце наздароўе. А як будзе гатова сьнеданьне, прыду будзіць, а пакуль ось памажэце занясьці шакалёў, — скончыла яна гутарку і пачала зьбіраць шакалі.

Я пачаў ёй памагаць. Праз мінут з пяць

я назьбіраў вялікую кучу шакалёў, зьвязаў крайкай і панёс у хату.

Алеся ішла наперадзе, кажучы:

— Ось, дзякую вам, толькі не кажэце бацьку, што змусіла вас працаваць.

Хутка шакалі былі ў хаце, а я апыніўся ў пуні на сьвежым, з прыемным пахам, сене. Цераз шчыліны я бачыў, як з коміна хаты падняўся сіненькі дым, выйшла з хаты Алеся з вядром, пасьля вярнулася нясучы ваду, а потым быццам яшчэ нехта прайшоў у хату з стрэльбай, і я ня прыкмеціў, як заснуў...

XXXI.

## Сон у пуні.

Чаму так цяжка стогне вецер за вакном?

Чаму галіны так нізка гнуцца да зямлі?

Чаму так цяжка на душы? Чаму нейкі сум мяне апанаваў, неяк жудасна робіцца...

Божа мілы! Калі-ж скончыцца гэта ночка над старонкай маей?

Калі Ты зьлітуешся над намі?

А вецер зноў так страшэнна завыў, рвануў галіны, сарваў колькі жоўтых лістоў і панёс іх у цёмную даль.

Божа Справядлівы!

Ты чуеш, як моляцца людзі Табе, Ты чуеш іх стагнату і сьвіст над імі бізуна, Ты бачыш іх сьлёзы і кроў...

Дык чаму-ж, Ты, Божа Справядлівы, ня спыніш нашай мукі, чаму?

Ось кроплі дажджу ў шыбу вакна часта загрукалі, засьвяціліся і, Божа мой мілы, я пазнаў!..

Гэта ня кроплі дажджу!

Не, не, ніколі! Гэта сьлёзы! сьлёзы!..

І выбег я з хаты.

Бег, як мог...

Вецер рваў на маёй галаве валасы, гнаў мяне, і чуў я голас у ім...

«Куды бяжыш? Навошта? Усё роўна ад іх нікуды не ўцячэш! Яны тутака разам з табою! Паглядзі!»

Я бег, і ня прыкмеціў, як апыніўся ў бура-чорнай вадзе. Наўкола мяне цёмныя хвалі жыгалі. Чуўся толькі плёхат вады. А голас нейкі ўсё шаптаў:

«А што бачыш? Куды ўцякаў? Ня мог на сьлёзы глядзець, а цяпер у чым апыніўся, ў чым стаіш? Паглядзі!»

І глянуў я на чорныя хвалі, якія ўжо біліся ў грудзі мае...

Дык ось якія гэта хвалі! Дык ось у якое я трапіў мора!

Былі гэта крывавыя хвалі...

Было гэта крывавае мора...

Усё вышэй і вышэй падымаліся яны...

Жудасна робіцца мне...

Няма ратунку! Няма!

Наўкола цемната...

Ось ужо чую я смак крыві на вуснах, зараз захліснуся...

Божа ратуй!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Я прачхнуўся. Халодны пот пакрыў мой лоб.

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

— Дык гэта быў сон! — праняслася ў мяне думка і, зьлезшы з сена, вышаў я з пуні, глянуў на неба. Тамака высока-высока ляцелі гусі.

---

XXXII.

## Сябры лесу.

Калі я ўвайшоў у хату, мяне сустрэлі вясёлым гоманам...

— А, ось і Дзяргач! лёгкі на ўспаміны! — загудзеў Ярэм.

— Ну, ось добра, што наведаўся, — кінуліся мяне абымаць Карп і Сымон.

— У нас тутака, сябра, гэтакая ціша, што іншы раз жывой душы цэлы год ня бачыш, — казаў Карп.

— Ну, дось гутаркі, сынкі, давайце гасьцю чарку. А дзе-ж запрапала нашая Елачка? — загудзеў Ярэм.

У гэты міг дзьверы адчыніліся і ўвайшла Алеся.

— Ось як, вы ўжо тутака, а я хадзіла вас будзіць і нават меркавала, калі зноў моцна сьпіцё, дык і ня будзіць, — казала яна.

— Не, гэтага ўжо досіць, праспаў сьнеданьне, дык трэба папалуднаваць, — казаў Ярэм.

Ну, дось гутаркі, сядайце! — рашуча загудзеў ён.

Мы ўсе селі за стол.

Алеся хутка ўставіла стол рознымі частункамі.

Тутака былі смажаныя качкі, бакасы, шчупакі і яшчэ нейкая дзічына.

На патэльні кравлася яешня, ў місцы ляжаў тварог, густа паліты сьмятанай, былі і салёныя грыбы і агуркі — чаго толькі душа жадае... Відаць было, што ўсё гэта даваў лес сваім жыхаром...

Алеся села побач са мною і пачала мяне частаваць кажучы:

— Цяпер я ад вас, дзядзька, не адстану, павінны есьці за двох і пакаштаваць усяго, сама пякла, сама варыла.

— Выпіць таксама павінны, — казаў Сымон, наліваючы дзьве чаркі і ставячы перада мной.

— Ну, што-ж — піць, дык піць.

— Бывайце-ж здаровенькія, жывенькія, дарагія мае сябры, дай Божачка, каб усё ў вас ішло добра! — сказаў я, выпіваючы адну за аднэй дзьве чаркі.

— Дзякуем, дзякуем! — адказалі ўсе мне ў адзін голас.

— Пеце і ешце! — гудзеў Ярэм.

— Абы здароў‘е, дык усё будзе, — цягнуў ён далей.

За гутаркай і ядой ды піцьцём мы ня прыкмецілі, як праляцеў добры час...

— Ну, здаецца, дзякаваць Богу, падпілі і пад‘елі добра! — ўстаючы, сказаў Ярэм, набожна певажагнаўшыся на абраз Хрыста, што вісеў у покуце хаты. Мы ўсе падняліся.

— А цяпер пойдзем на сьвежае паветра, — запрапанаваў Карп.

Усе вышлі.

Па небе беглі белыя воблачкі. Сонца ўжо пачынала каціцца на адпачынак.

— Восень цікуе хітрай вужакай, — сказаў Ярэм, глянуўшы на бліжнія дубы, бярозы і грабы.

Я зірнуў на іх, і праўда: ўжо лісты пачыналі патроху жаўцець. Мне ад гэтага зрабілася неяк сумна, відаць было. што і сяброў маіх таксама агарнула нуда. Недзе далёка закрычалі жураўлі і гусі.

— Ці не ў паход яны ўжо пачынаюць ад нас зьбірацца, — перарваў маўчаньне Сымон.

Гэта было сыгналам і пачалася агульная гутарка, за якой правялі мы шмат часу. Я расказаваў аба ўсім, што чуў, што робіцца на сьвеце і як наша справа...

Ужо пачынала схіляцца сонца, калі над самымі нашымі галовамі закрычалі гусі.

Мы ўсе паднялі ўгару галовы.

Я глядзеў на ляцеўшыя гусі і думкі мае былі невясёлыя...

---

## XXXIII.

# Гусі ляцяць.

Гусачкі, вы, мае! Куды-ж вы ляціцё! Куды-ж долю маю нясеце? Гусачкі, адгукнецеся!...

Гусачкі ня чуюць мяне!..

Каб яны бачылі, як цяжка нам, цык не пакідалі-б нас...

Добра нам з вамі толькі сярод глухіх лясоў, дзе ня бачаць нас людзі...

Вось схаваліся за хмарай і толькі чутно, як яны, лецячы над лесам і балотам, крычаць, быццам кідаючы нам апошняе бывай!..

Цяжка на сэрцы зрабілася...

Апошнія, праменьні сонца на лістох дрэваў чырвонай зарніцай яшчэ гарацць, але ось момэнт і цёмна зрабілася ў лесе...

На далёкім небе зорка яскравая зьявілася...

Туды, да яе, цяпер гусі ляцяць.

Ночкай гэтай яны адпачынуць, а заўтра, чуць-сьвет, паляцяць ад нас...

Хутка, ўжо хутка, пад сьнегам замоўкне!

Будзе стаяць, нібы ў цяжкай думцы, насунуўшы сівыя бровы, сярдзіты і паважны...

Калі-ж зноў прыйдзе вясна і цёплае сонца растопіць белы сьнег...

Зноў, над лесам угледзеўшы ў небе высокім, пад белымі хмаркамі, зьвястуноў вясны, я лесу цёмнаму скажу:

«Ня сумуй, браце! Ось бачыш, гусі зноў да нас ляцяць!»...

XXXIV.

## Думкі ў лесе.

Думкі мае, як хвалі бягуць адна за аднэю спакойна, ціха, то раптам узьнімуцца вялікай грознай сьцяной...

Сэрца, быццам сьціснутае перадсьмяротнаю мукай, замрэ і жудасна зробіцца мне...

А лес усё шапоча свае цудоўныя казкі, кажа пра славу маіх прадзедаў, пра іх страшэнныя мукі за волю старонкі радзімай, бітвы, дзе вораг уцякаючы шукаў ратунку сярод гушчару лесу і гінуў там, бо лес, гэты лес, заўсёды быў добрым хаўрусьнікам маіх праайцоў...

Казаў і пра тое, як вораг, нішчачы вёскі, гарады, сёлы, мястэчкі, гнаў у далёкую няволю жанок, дзяўчат і ось ён, гэты цёмны лес, ратаваў сярод сваіх густых галін маіх братоў ад зьдзеку і нядолі...

Думкі бягуць...

Лес цёмны шуміць...

Жудасна сьціскаецца душа і чую я, як праз шум галін нечы голас магутны кліча...

«Ня сумуй, браце, што нядоля пануе над

старонкай радзімай, што льецца кроў братоў, што поўны ёю муры ў вялікіх турмах... Ня сумуй!..

Хутка прыдзе час і на помач прыду я да вас...

Сярод маіх глухіх месцаў зьбярэцеся на вялікую нараду і ніхто ня будзе перашкаджаць вам, на варце стану я...

Стагнаньне братоў тваіх дайшло да мяне і мушу я паклікаць усіх, у кім б'ецца, гарыць агнём барацьбы душа... Годзі зьдзеку і кайданоў!

Мае казкі навучаць вас, як гінуць горда ў барацьбе і сьцяг вольнай старонкі высока трымаць у руцэ!»...

Страшна загудзеў стары лес. Затрашчалі карэньні, галіны, завыў вецер, яркая маланка засьляпіла вочы... і страшэнны грукат патрос зямлю...

«Ня сьпеце-ж, браты, бо надходзе гадзіна, калі паклічу я вас!».

Пачуліся грамавыя словы з вяршынак дрэваў...

Зноў усё сьціхла...

Месячык сьвяціў з-за хмаркі. Зоркі дзеня-дзе блішчэлі...

Сьціхлі думкі, сум толькі застаўся, а душа ўсё слухала казкі лесу і ён шаптаў ёй: «Слухай толькі мяне»...

XXXV.

## Лес шапоча.

Аб чым ён кажа, куды кліча так доўга нас? Якую таемную быль хоча нам расказаць? Пра дзеі прадзедаў маіх? Мо' пра лік сваіх магіл, а мо' пра тое, аб чым марыць увесь час душа?...

Хто зразумее яго? Хто прыдзе на покліч?

Ось зноў ён шапоча — ня слухаць яго ня можа душа...

Штось вялікае ўздымаецца ў грудзёх, быццам хутка зразумее душа, аб чым шапоча, чаго хоча, куды кліча стары, цёмны лес!..

Кажы, кажы, мілы лес, сэрцу хутчэй свае казкі...

Ад твайго голасу душа ясьнее і думкі сьмелыя паўстаюць...

Кажы нам, лес, хутчэй!

Навучы, як ратаваць старонку, як пабудзіць братоў ад сну, як вызваліць з нядолі і кайданоў братоў... Навучы нас быць сьмелымі!

Пакажы той шлях, па якім-бы пайшоў увесь наш народ да лепшае долі, знайдзі той сьцяг, за якім ішлі нашыя прадзеды!

Дай нам магчымасьць хутчэй зразумець цябе!

Шапоча лес нам казкі цудоўныя, казкі, мудрыя!

— Сябры! У кім б'еццa сэрца брата-беларуса, той даўно ўжо зразумеў таемныя казкі лесу і чакае, пакуль ня дасьць ён знаку пачаць тварыць тое, што пачалі прадзеды!

Стаць цьвёрда на той шлях, на якім шмат ляжыць байцоў за край наш родны, край загнаны!

Па ім ісьці нам трэба, там знойдзем мы патрачаны наш сьцяг...

Яго падняць павінны мы! Падняць высока, каб усім яго відаць было!

Каб ведалі ворагі, што ня згінуў дух волі ў сэрцах маіх братоў, што даб'ёмся мы волі старонкі і сьцяг наш горда будзе зьяць!..

Дык шапчы, лес! Шапчы далей свае нам казкі! Табе мы дзякаваць будзем, што навучыў нас выбрацца з нядолі...

---

## XXXVI.

# Хмара ідзе.

Ня відаць сьвету, цёмна зрабілася ў лесе.

Панура загудзеў стары лес, затрашчалі галіны, зашамацела лісьцьцё, сьціхлі птушкі.

Вецер сярдзіта выў, стараючыся вырвацца на волю з моцных абцугоў лесу—але бароўся, трымаў яго лес, б'ючыся з непагодай.

Горда стаяў ён, гледзячы на сьмерць сваіх сяброў і біўся далей з бурай.

Цёмная хмара, як ноч закрыўшы неба, напаўзала на лес...

Страшэнны вецер ляцеў, стараючыся сваім імпэтам зьнясьці дубы, грабы, сосны, елкі, бярозы, але дзе там!

Стоячы ў цеснай грамадзе, як адзін, байцы сустрэлі ворага і пачалася бойка: трашчаць карані дрэваў, ламаюцца галіны, сыплюцца лісты.

Круціць, ламае віхар—няма зьлітаваньня...

Белыя бярозкі гінуць адна за аднэй і кроплі дажджу паліваюць іх упаўшыя целы...

Ось затрашчаў стары дуб, шарахнуўся на зямлю...

Радасна завыў вецер над ім, закруціў галіны, сарваў лісьцьцё і панёс яго высока ў цёмную хмару...

Здавалася яму, што загінуў ужо стары лес, ляжыць зьніштожаны ў порах...

Але мыліўся вецер.

Лес далей змагаўся, хоць шмат панес ён страты ў сяброх...

Байцы горда глядзелі ў вочы съмерці, бо ведалі, што іншыя прыдуць, за іх радамі паўставалі новыя рады байцоў...

Бо ня век-жа будзе панаваць цёмная хмара. ня век будзе сьмяяцца нядоля над пакутай, ня век!..

Прыдзе гадзіна, разойдзецца хмара па небе, разгоне вецер яе, разьмяце і зноў сонца засьвеце.

Засьвеце яскравымі праменьнямі, залеча раны старога лесу, асуша сьлёзы, зноў ціхую, цудоўную казку зашапочуць галіны, зноў ночка спакойная прыйдзе і за сабой шмат зорак прывядзе...

Ціха будуць галіны купаць сваё лісьцьцё ў серабрыстых хвалях Лані...

Будзе мець награду лес ад Бога, што вытрымаў барацьбу...

## XXXVII.

# Лес плача.

Ці чулі вы калі, як плача лес?

Як горача б'еццa яго сэрца? Ці бачылі яго сьлёзы?

Не, не, мусіць, ніколі!..

Гэта было ціхаю ночкаю, калі ніводзін ліст ня дрыжаў ад ветру, калі зоркі таемна сьвяцілі з высокага неба і дубы глядзелі ў цёмную ваду быстрай Лані...

Тады я чуў, як плача стары лес і бачыў яго сьлёзы...

Аб чым ён плакаў? Ці аб прошлых гадох свае славы, аб загінуўшых сяброх, ці мо' аб людзях, што марна гінуць у жыцьці, а мо' аб хвалях Лані?..

Не, не! Не аб тым плакаў стары лес...

Ён плакаў і цяпер яшчэ плача аб нядолі свае старонкі...

Схіліліся галіны бярозкі да галін дуба, стаяць панура елкі, маркотна глядзяць на зоркі вялікія сосны...

Прыціхлі асіны і лісты іх ня дрыжаць... і нейкі жудасны жаль лес апанаваў...

Ціха бягуць хвалі халоднай Лані, слухае балючыя словы лесу, цёмны сітняг...

Нейкі жудасны нібы стогн нясецца з галін дрэваў і за сэрца страх бярэ.

Чую нібы капаюць нечыя гарачыя сьлёзы на краскі, на зялёны мурог з лісьцьця дрэваў...

Я ведаю і сэрцам чую—гэта плача стары лес...

Ня плач, мой стары прыяцель магутны!

Табе ня трэба плакаць!

Ляпей ты мне казку былых гадоў скажы, каб мог я маіх братоў да згоды паклікаць...

Не, ня чуе мяне стары лес!

Капаюць яго горкія сьлёзы, нясецца цяжкі ўздох...

Зорак праменьні іграюць яскрава ў хвалях Лані...

Пачаў казку казаць прачнуўшыйся сітняг...

Усё ціха...

Хутка ўжо, хутка зоркі згінуць адна за аднэю, неба асьвецяць сонцавы праменьні...

Вецер нудныя думкі разгоне, зашуміць цёмны лес, засьпяваюць птушкі ў галінах, засьмяецца, весялей панясе свае хвалі Лань...

А, пакуль што, плача стары лес і капаюць на зямлю яго сьлёзы...

---

## XXXVIII.

# У цёмную даль.

Прабыўшы некалькі дзён у Ярэма, я пачаў такі зьбірацца ў далёкі шлях.

Алеся трохі засмуцілася...

Карп, Сымон і Ярэм прапанавалі пасядзець да саннае дарогі дый папрацаваць у ваколіцах, але я мусіў такі адмовіцца ад усіх прапазыцыяў...

Трэба было сьпяшацца, каб у час папасьці туды, куды ўжо шмат нашых сяброў пацягнулася.

Дзень расстаньня надыйшоў.

Я выяжджаў пад вечар.

Шчыра падзякаваўшы ўсіх сваіх блізкіх сэрцу сяброў, я выйшоў з хаты...

— Не запамінайце нас, — сказала Алеся і змахнула рукой сьлязу...

Мілая дзеўчына, ці магу я запомніць таго, хто першы краску яскравую першай вясны мне падарыў!

Не, ніколі!

А цяпер, цяпер! лёс майго жыцьця кідае мяне ў хвалі, хвалі цёмныя, невядомыя...

Але веру моцна, моцна веру!! Зьвярнуся хутка я да цябе, мая любая дзяўчына! Будзем зноў разам слухаць казкі Лані, лесу і сітнягу.

Усе выйшлі з хаты. Я з Карпам сеў на воз. Коні крануліся.

Бывайце-ж жывы, дарагія! Жывеце і чакайце...

Мы ехалі лесам у няведамую даль...

Калі была ўжо поўнач, мы выехалі з лесу і пад'ехалі да старое карчмы, ў якой жыў стары Янкель...

Ен адчыніў нам дзьверы... мы ўвайшлі... на стале гарэла сьвечка...

Праз гадзіны тры я сьціснуў моцна руку Карпу. Ен ехаў дамоў, да сябе ў лес...

Я застаўся адзін.

Уставала халодная, васеньняя зарніца...

## XXXIX.

# Маім братом.

Сумна мне. Вецер гоне па небе цяжкія хмары, зрывае жоўтае лісьцьцё з дрэваў і васеньнюю песьню пяе...

Сумна мне!

Душу і сэрца скавалі думкі цяжкія, як хмары, цісьнуць, гнятуць і ось, здаецца, што зараз пачую хаўтурны я звон...

А ён даўно ўжо нясецца, працяжна жудасна па ўсёй старонцы маёй, кудысь кліча, маніць абяцанкай спакою, дрыжыць ён у сэрцы маім...

Калі мы адпачынем?

Калі над нашай зямлёй будзе сьцяг толькі наш зьвяць?

Калі сьмела скажам усім, што хочам жыць сваім жыцьцём, сваею уласнаю гаспадаркаю!

Мусіць ніколі?..

Сумна мне...

Нясуцца над хатай крумкачы. Чую я сэрцам бяду...

Да каго зьвярнуцца ў гэтую пару? Маліцца — каму?..

Каб уратаваў нас ад цяжкай нядолі, каб на шлях просты выйсьці дапамог...

Той, хто абяцаў дапамогу — здрадзіў і ў крыўду на вечныя мукі нас аддаў, пакінуў лёс наш у кайданох назаўсёды!..

Ось вецер заплакаў і хмары сьлязьмі закапалі...

Эх, цяжка мне, людзі!

Дайце хоць чарку на астатку жыцьця!

Сумна мне...

---

XXXX.

## Сярод поля.

Я адзін сярод поля, толькі адзін...

Наколькі хапае вока, нікога ня відаць.

Сьнег, паўсюль сьнег...

А на небе высокім толькі зоркі гарэць...

Я адзін, толькі адзін, сярод поля...

Не, няпраўда, думкі, як хмары, заўсёды пры мне!

Мае думкі, думкі цяжкія, жудасныя думкі!

Яны заўсёды са мной...

Сьнег, толькі сьнег і зоркі на небе...

Я і думкі і больш нікога...

Буду маліцца сярод поля, буду да сябе клікаць Бога!..

Хай прыдзе цяпер да мяне, хай прыдзе!..

Бо застаўся я адзін, адзін сярод поля, людзі пакінулі мяне аднаго...

Але я не баюся! Хай я адзін сярод поля, хай адайшлі ад мяне ўсе, але неба засталося і Бог прыдзе да мяне!..

Я веру, што хутка малітва мая да яго даляціць...

Ен пачуе яе, і жаль, жудасны жаль душы мае, зразумее і скажа словы свае, якія я ў сэрцы сваім захаваю...

Я хутка з поля прыйду да тых, якія ўцяклі ад мяне, з Божым словам...

Тады ня будуць уцякаць, тады будуць шукаць мяне...

А цяпер, цяпер я адзін сярод поля з малітвай сваей.

Сьнег, толькі сьнег і зоркі на небе...

Думкі, малітва і я...

**Дзяргач.**

**Вёска Міцкавічы, на Палесьсі.**

BIBLIOTEKA NARODOWA

BN
BIBLIOTEKA NARODOWA
506263